Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 236 (5069)
КАСТРЫЧНІКА
21
НЯДЗЕЛЯ
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

САКРАТАРУ ЦК КП(б)Б т. ГІКАЛО, СТАРШЫНІ СНК БССР т. ГАЛАДЗЕДУ

Прамысловасць штучнага валакна, дасягнуўшая пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б) і правадыра партыі таварыша Сталіна значных поспехаў, арганізавала на Магілеўскай фабрыцы — перадавой з ўсіх фабрык гэтай прамысловасці — усесаюзную канферэнцыю для барацьбы за права фапартаваць VII з'езду Советаў аб перавыкананні плана другога года другой пяцігодкі. Канферэнцыя ўпэўнена, што пад вашым непасрэдным кіраўніцтвам і дзякуючы вашай дапамозе Магілеўская фабрыка будзе першай рапартаваць вярхоўнаму органу краіны Советаў аб выкананні пастаўленай ёю задачы.

ПРЭЗІДЫУМ КАНФЕРЭНЦЫІ.

СТВАРЫЦЬ РАШУЧЫ ПЕРАЛОМ У ІЛЬНОЗАГАТОЎКАХ—СПРАВА ГОНАРУ КОЖНАЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

Пераключэнне 50 проц. рабочай сілы на апрацоўку ільну; рэгулярная выдача хлеба на ільняных працадніях; строгае правядзенне закона аб удвоенай аплаце ільнянога працадня—вось што зараз рашае тэмпы ільнозагатовак

ІЛЬНОМ РАПАРТАВАЦЬ У ОКЦЯБРСКУЮ ГАДАВІНУ

Наша рэспубліка сяўбу і ўборку ільну правяла першай па Саюзу. Здавалася-б, што і апрацоўку і здачу ільну дзяржаве БССР павінна была-б весці ўзорна. Між тым даныя аб ільнозагатоўках на 15 кастрычніка паказваюць адваротнае. Ужо паўтара месяца рэспубліка вядзе ільнозагатоўкі, а план выканан менш, чым 30 проц. На рашаючым участку сельскагаспадарчых работ наша БССР пачынае здаваць свае перадавыя пазіцыі.

Устае пытанне — ці ёсць якія аб'ектыўныя прычыны для апраўдання такіх ганебных тэмпаў ільнозагатовак? Няма. Даволі прывесці прыклад **Аршаншчыны,** дзе калгасы ўжо апрацавалі і здалі 71,3 проц. валакна; прыклад **Сенненшчыны,** дзе выкананы план здачы трасты і здана 51,2 проц. валакна; **Сіроціна,** дзе апрацавана і здана 61,8 проц. валакна, — каб закляйміць ганьбай усякага, хто спашлецца на аб'ектыўныя прычыны. Хіба не ганьба для Гомеля (сакратар ГК Шафарэнка, старшыня ГС Малашонак, нач. палітаддзела Валошынаў), што ён выканаў на 15 кастрычніка 0,6 проц. плана. Мы пытаемся ў гомельскіх кіраўнікоў: хіба так большэвікі праводзяць у жыццё рашэнні ЦК ВКП(б)? Або ўзяць другі прамысловы раён — сусед Гомеля — Рэчыцу (сакратар РК Малінін, старшыня РВК Саўкоў, нач. палітаддзела Новікаў). Хіба так большэвікі выконваюць заданні партыі і ўрада? Дапусціць, каб раён да 15 кастрычніка здаў дзяржаве толькі 2,5 проц. ільну, могуць толькі «пільны, праўда, з партыйным білетам у кішэні, але ўсё-ж пільны» (Сталін). Няхай аб гэтай ацэнцы правадыра партыі ўспомняць кіраўнікі **Нараўлянскага, Камарынскага, Чэрвеньскага, Старадарожскага, Петрыкоўскага, Лоеўскага, Ельскага, Клічаўскага, Хойніцкага, Чачэрскага, Дуброўенскага, Плешчаніцкага, Клімавіцкага, Быхаўскага** і іншых адстаючых раёнаў і сапраўды. Мы маем зараз найбольш спрыяючыя ўмовы для апрацоўкі ільну. Жаночая рабочая сіла ў калгасах зараз амаль зусім свабодна. Свабодна і значная частка мужчын. Здавалася-б, апрацоўка ільну магла-б ісці такімі тэмпамі, каб даваць у пяцідзёнку мінімум 10-15 проц. Ганебныя тэмпы ільноапрацоўкі гаворыць аб тым, што **кіраўніцтва калгасамі з боку РК, РВК, палітаддзелаў аслабла, а аслабленне кіраўніцтва немінуча прыводзіць да аслаблення працоўнай дысцыпліны, да ажыўлення дзейнасці класава-чужых элементаў.**

Калі ў Гомелі, Рэчыцы, Клімавічах і т. д. за паўтара месяца здалі менш 5 проц. ільну, гэта значыць, што ў калгасах гэтых і другіх адстаючых раёнаў пануе дробнабуржуазная расхлябанасць, што тут аслабла вытворчая дысцыпліна. І за ўсё гэта ў першую чаргу адказваюць комуністы, кіраўнікі гэтых раёнаў. З гэтым апартуністычным самацёкам трэба рашуча і неадкладна пакончыць.

Што зараз рашае тэмпы ільнозагатовак?

Па-першае, трэба **арганізаваць апрацоўку ільну.** Наладзіўшы аператыўнае кіраўніцтва **кожным** калгасам, РК, РВК і палітаддзелы павінны дабіцца, каб **мінімум 50 проц.** рабочай сілы ў калгасах занялося апрацоўкай ільну. **Кожны калгас, кожная аднаасобная вёска павінны атрымаць штодзённыя заданні па здачы валакна і трасты. Траста павінна быць адвезена на ільнозаводы ў працягу астаўшыхся кастрычніцкіх дзён.**

Па-другое, трэба стражайшым чынам правесці ў жыццё закон урада аб выдачы хлеба ільноздатчыкам і рэгулярнай раздачы хлеба па ільняных працадніях. Тое, што паведамляюць нашы спецкоры з Лепеля і Ушач, заслугоўвае неадкладнага ўмяшання **пракуратуры рэспублікі.** Можна толькі здзіўляцца: аб чым думаюць раённыя кіраўнікі і пракурор у Лепелі? Трэба неадкладна судзіць і строга пакараць усіх тых, хто свядома сабатуе або скажае закон урала аб размеркаванні хлеба, атрымліваемага за лён выключна па ільняных працадніях. **Выдаючы хлеб кожную пяцідзёнку па ільняных працадніях,** мы забяспечым рашучы пералом у апрацоўцы ільну.

Па-трэцяе, трэба стражайшым чынам правесці ў жыццё закон урада аб **падвоенай аплаце** ільняных працадзён. Між тым, ёсць шматлікія сігналы аб тым, што ільняныя працадні асобна не пісваюцца, што калгаснікі не ведаюць аб наяўнасці выпэйуказанага закона, што па многіх калгасах ільняныя працадні ацэньваюцца па-старому.

Няхай адстаючыя РК, РВК, палітаддзелы перастануць займацца паперовымі заклінаннямі, зойміцца **канкрэтна** арганізацыйнай працы па ільноапрацоўцы, правядуць у жыццё закон аб падвоенай аплаце — і пералом будзе забяспечан.

Велізарную ролю можа і павінна адыграць **социялістычнае спаборніцтва** трапальшчыц і іншых, працуючых па ільну. Арганізуем конкурсы трапальшчыц па сельсоветах, раёну, вывесім на таках чорныя і чырвоныя дошкі, скарыстаем сістэму штодзённых або пяцідзённых прэміравнняў лепшых ударнікаў ударніц, вось дзе ключ да большэвіцкіх тэмпаў апрацоўкі ільну.

Але нам патрэбны не толькі большэвіцкія тэмпы, але і **якасць ільну.** Нумар здаваемага ільну ганебна зніжаецца. **Асвея,** напрыклад, ужо ўхітрылася здаць валакно № 6,5 замест планавага № 7. **Сянно,** пачаўшы здачу высокім нумарам, скацілася ўжо да № 9,3 і стаіць перад рэальнай пагрозай выкапаць план нумарам ніжэй летапшняга. У барацьбе за якасць рашаюць **сартаванне трасты перад пасадкай у ёўню, адлежка трасты пасля сушкі і мяцця, чыстая вытрапка, сартаванне натрапанага валакна.**

Мы ні на хвіліну не павінны забыць, што якасць валакна — **гэта ўчастак абвостранай барацьбы ў калгасах, што класава-чужыя, рвацкія элементы падрываюць гэту барацьбу.** Асабліваю ўвагу — **барацьбе з празмернымі адыходамі.** Было-б злачынным паўтарыць памылкі мінулага года, калі ў выніку трапання гарачага ільну, намеранай абсечкі ільну, у адыходы пайшлі тысячы тон валакна.

Скарыстаем вопыт **перадавых** калгасаў і аднаасобнікаў. Няхай вопытныя ільнаводы, трапальшчыцы, сартавальшчыкі перадавых калгасаў перанясуць свой вопыт у адстаючыя.

Рапартаваць ільном у Окцябрскую гадавіну — такі баявы лозунг дня.

АБ ПАСТАНОЎЦЫ ПАРТЫЙНА-МАСАВАЙ РАБОТЫ Ў ШКЛОЎСКАЙ І ПУХАВІЦКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯХ

Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б устанаўляе, што Шклоўскі і Пухавіцкі райкомы партыі не перабудавалі работу партарганізацыі ў адпаведнасці з рашэннямі XVII з'езда ВКП(б), што яны (райкомы) не паставілі галоўнай задачай ідэйнае згуртаванне партарганізацый, актывізацыю ўнутрыпартыйнага жыцця і ўзмацненне штодзённага кіраўніцтва совецкімі, профсаюзнымі, комсамольскімі і іншымі арганізацыямі, а па сутнасці ў сваёй практычнай рабоце падмянялі гэтыя арганізацыі, перакладаючы гэту работу на партыйны апарат, і, як вынік, гэтыя раёны плятуцца ў хвасце па выкананню ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній.

а) Сапраўдная большэвіцкая перабудова ў гэтых раёнах была падменена па сутнасці толькі фармальнай перастаноўкай людзей і зменай назваў. За ўвесь час райкомы не правярылі і не заслухалі на сваіх пасяджэннях ні адной пярвічнай партарганізацыі, парторга, асобнага комуніста па пытаннях партыйнай работы.

б) Крайне слабая пастаноўка работы па падняццю ідэйна-палітычнага ўзроўню комуністаў (слабасць марксісцка-ленінскага выхавання, адсутнасць работы з комуністамі ў паасобку, адсутнасць работы са спачуваючымі і т. д.).

в) Партыйныя сходы з-за адсутнасці падрыхтоўкі да іх і праверкі выканання рашэнняў фактычна ператварыліся ў простую гаварыльню, а не з'яўляліся школай выхавання комуністаў. У выніку ў арганізацыі маюць месца элементы бытавога разлажэння, парушэння партыйнай і совецкай дысцыпліны.

г) Замест таго, каб узмацніць партыйна-масавую работу ў арганізацыях, чула і ўважліва адносіцца да запросаў мас, замест большэвіцкай работы з кожным комуністам, дапамогі яму, замест большэвіцкіх метадаў выканання членаў партыі, кандыдатаў — райкомы сталі на шлях адміністравання і камандавання. У рэзультаце значная частка партарганізацыі была падвергнута партыйным спагнанням.

д) Адсутнасць пастаяннага кіраўніцтва інструктарамі, скарыстанне іх не як большэвіцкіх арганізатараў мас, а ў якасці ўпаўнаважаных па сельсоветах, па кампаніях прывялі да таго, што фактычна інструктары райкомаў выконвалі адміністратыўныя функцыі.

Бюро ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. За недапушчальныя адносіны да перабудовы партыйнай работы, за падмену масавай работы адміністраваннем аб'явіць сакратару Пухавіцкага райкома партыі т. Скараходу і сакратару Шклоўскага райкома т. Шпаку — вымову. Папярэдзіць, што калі яны ў бліжэйшы час не перабудуюць сваю работу, ЦК прыме самыя рашучыя меры.

2. Прапанаваць Пухавіцкаму і Шклоўскаму райкомам перагледзець свае рашэнні, звязаныя з масавым вынясеннем партспагнанняў членам і кандыдатам партыі.

3. Абавязаць райкомы непасрэдна дапамагаць пярвічным партыйным арганізацыям у правядзенні партыйных дзён, падрыхтоўцы дакладчыкаў, праверцы выканання рашэнняў сходаў комуністаў. Дабіцца таго, каб партыйныя сходы сталі школай партыйнага выхавання.

4. Абавязаць тт. Скарахода і Шпака асабіста і штодзенна кіраваць работай інструктароў і аказваць дапамогу ў іх рабоце. Інструктар на справе павінен стаць асноўным звязваючым звяном сакратара райкома партыі з пярвічнай партарганізацыяй і комуністамі-адзіночкамі.

5. Райкомы партыі на сваіх пасяджэннях павінны сістэматычна заслухоўваць пытанні ўнутрыпартыйнай работы і партыйнай вучобы, як пярвічных партарганізацый, так і асобных комуністаў, прычым асаблівую ўвагу трэба звярнуць на работу з комуністамі-адзіночкамі.

6. ЦК зварачае выключную ўвагу райкомаў на неабходнасць падняцця ідэйна-палітычнага ўзроўню партыйных арганізацый. Марксісцка-ленінскае выхаванне павінна быць пастаўлена ў цэнтр увагі. Райкомы ўсёй сумай сваіх арганізацыйных, масава-палітычных мерапрыемстваў павінны дабіцца такога становішча, каб кожны комуніст сапраўды быў важаком мас, з'яўляўся прыкладам у грамадскім жыцці і асабістым жыцці.

ЯК У ЛЕПЕЛІ „СТЫМУЛЮЮЦЬ" ПЕРААПРАЦОЎКУ ІЛЬНУ

(Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

У калгасе **«Чырвоны прамень»,** Пышнянскага сельсовета (Лепельскі раён), ураджай ільну ў гэтым годзе быў надзвычайны. Кожны гектар у сярэднім даў 3 цэнтнеры валакна 10 нумара і 2,8 цнт. ільносемя.

Праўленне калгаса абавязана было растлумачыць калгаснікам кошт ільнянога працадня, бо вялікая ўраджайнасць ільну, добрая яго апрацоўка значна ўзнялі вагу кожнага працадня калгасніка. Аднак, у калгасе «Чырвоны прамень» справа абарочваецца зусім інакш. Яшчэ вясной калгас атрымаў па кантрактацыйнаму дагавору 5 цэнтнераў хлеба і інш. прадуктаў для размеркавання па ільняных працаднях. Гэты хлеб быў размяркован па дварах без уліку ільняных працадзён. Гэтым самым ільняны працадзень у калгасе быў значна зніжан.

Зараз калгас атрымаў 2 тоны хлеба для калгаснікаў, занятых на ільноапрацоўцы. Пачалася выдача. Старшыня калгаса Мацкевіч даў распараджэнне зусім не выдаваць хлеба калгаснікам, якія працуюць на сартаванні. Толькі некалькі цэнтнераў хлеба раздана трапальшчыцам, а астатняя колькасць пайшла на патрэбы калгаса. Проста гаворачы, вызначаны хлеб на ільняныя працадні ў калгасе разбазаран.

Пры размеркаванні хлеба паміж трапальшчыцамі дапушчана грубейшая памылка. Тут не ўлічвалі, колькі трапальшчыца выпрацавала працадзён, якая якасць работы. Размяркоўвалі па-ўраўнілаўску.

У калгасе не ведаюць, колькі калгаснік, які працуе на ільне можа атрымаць па свой працадзень. Аб тым велізарным прыбытку, які можа калгас атрымаць пры захаванні ўраджаю ільну, не растлумачана.

У выніку ў гэтым калгасе на лён зварачаюць зусім мала ўвагі. Замест 10 нумара трапальшчыцы даюць 6 і 8 нумар валакна. Апрацоўка ільну ў калгасе зрываецца. На ільне працуе толькі 20 калгасніц, а астатнія гуляюць. Нормы выпрацоўкі, як правіла, не выконваюцца. У гэтым няма ніякай зацікаўленасці. Лепшай трапальшчыцы Буйніцкай Марыі, якая перавыконвае норму, запісваюцца 2 працадні, а Буйніцкай Домне, якая вытропвае 2 кгр.,— таксама 2 працадні.

Калгас «Чырвоны прамень» у раёне — не выключэнне. У калгасе «Пражэктар», Свяцкага сельсовета, ільняныя працадні зусім не ўлічваюцца. Выдзелены фонд хлеба ў колькасці 15 цнт. для размеркавання на ільняныя працадні, разбазараецца. Ні аднаго кілограма не размеркавана паміж калгаснікамі, якія заняты на ільноапрацоўцы.

Выдачай авансаў на ільняныя працадні ў раёне не кіруюць. Раённае аддзяленне Заготільна не ўлічыла ўсёй важнасці своечасовай выдачы авансаў калгасам за зданую ільнопрадукцыю. На складзе Заготільна ляжыць 200 тон хлеба, звыш 11 тон алею, 1,5 тоны цукру, рыбы і іншыя тавары, але калгасам, якія здаюць ільнопрадукцыю, гэтыя тавары чамусці не выдаюцца.

А. ЛОСЬ.

Лепшы і старэйшы сушыльшчык трасты, калгаснік-ударнік Баркоўскі Васіль з трастой (калгас «Немойта», Сенненскага раёна).

УСЮ ВІНУ ЗВАЛЬВАЮЦЬ НА СЕЛЬСОВЕТЫ

(Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

ЦК і СНК у сваім рашэнні аб ільнозагатоўках у Ушацкім раёне запісалі, што «найбольш неарганізавана і безадказна справа першапачатковай апрацоўкі, ільнозагатовак пастаўлена ў раёнах Бялыніцкім, які выканаў на 5 кастрычніка 2,4 проц. і Ушацкім — 7 проц.» І далей ЦК і СНК вынеслі вымову сакратару райкома і старшыні РВК.

Здавалася-б, што Ушацкі РК, РВК і палітаддзел, абмяркоўваючы пастанову ЦК і СНК, павінны былі ў першым пункце сказаць, як-жа раённае кіраўніцтва змагалася за лён, самакрытычна прызнаць свае памылкі, каб на гэтым факце мабілізаваць усю партарганізацыю.

Для таго, каб паказаць, як раённае кіраўніцтва займаецца алілуйшчынай, прыводзім цалкам першы пункт пастановы РК, РВК і палітаддзела, вынесенай 13 кастрычніка — у дзень атрымання пастановы ЦК і СНК.

«Не гледзячы на рад папярэджанняў з боку РК, РВК і палітаддзела аб неабходнасці ўзмацнення тэмпаў апрацоўкі і здачы дзяржаве ільновалакна і трасты, калгасы і сельсоветы не зрабілі з гэтага для сябе належных вывадаў».

Далей пералічваецца рад сельсоветаў і калгасаў. На гэтым канстатуючая частка канчаецца.

Нежаданне прызнаць свае памылкі, звальванне ўсёй віны на сельсоветы, парторгаў і старшынь калгасаў прывяло к таму, што нават і зараз, пасля пастановы ЦК і СНК, намечаны штодзенны аператыўны план не выконваецца. Да апрацоўкі ільну ручным спосабам не прыступілі. А там, дзе і прыступілі, то працуе ўсяго 10-12 проц. рабочай сілы.

Для таго, каб нагнаць процант, раённае кіраўніцтва пашло па шляху прамога сабатажу, даючы дырэктывы калгасам, дзе ёсць добрая траста, здаваць трасту звыш плана замест валакна. Гэта скарыстаў рад калгасаў для адцягвання здачы валакна.

Да гэтага часу ні адзін калгас не атрымаў хлеба за зданую трасту і валакно. Заготлён не выдае хлеба, тлумачачы адсутнасцю нарадаў, а на складах Заготільна ляжыць больш 300 тон хлеба.

НЕЙДЛІН.

УЛІЧЫЦЬ УРОКІ ПУХАВІЧ І ШКЛОВА

Сёння мы публікуем пастанову ЦК КП(б)Б аб пастаноўцы партыйна-масавай работы ў шклоўскай і пухавіцкай партарганізацыях. Гэта пастанова мае выключна вялікае палітычнае і практычнае значэнне ў рабоце для усёй КП(б)Б.

Асноўным і рашаючым недахопам у гэтых арганізацыях з'яўляецца тое, што яны не перабудавалі ўсёй сваёй работы ў адпаведнасці з рашэннямі XVII з'езда ВКП(б). І, як вынік, замест ажыўлення ўсёй унутрыпартыйнай работы, замест ідэйнага згуртавання партыйнай арганізацыі, замест кіраўніцтва і дапамогі комуністаў, райкомы заняліся камандаваннем, голым адміністраваннем, масавым вынясеннем партыйных спагнанняў.

З матэрыялаў аб шклоўскай і пухавіцкай партарганізацыях, якія мы не раз друкавалі, выявілася адсутнасць перабудовы, адсутнасць большэвіцкага стылю работы ў гэтых райкомах партыі. У прыватнасці **«Звязда»** паказала, як у пухавіцкай партарганізацыі няма чулых адносін да запатрабаванняў мас, як груба парушаецца рэвалюцыйная законнасць.

Урокі Пухавіч і Шклова з'яўляюцца сур'ёзнейшым папярэджаннем для ўсіх партарганізацый.

Толькі адсутнасцю большэвіцкай перабудовы можна вытлумачыць той факт, што рад раёнаў БССР не сходзяць з чорнай дошкі, плятуцца ў хвасце па выкананню гаспадарча-палітычных кампаній.

Жыткавіцкі, Петрыкоўскі, Асіпавіцкі, Бялыніцкі, Старадарожскі і іншыя раёны не займаюцца пытаннямі ўнутрыпартыйнай выхаваўчай работы так, як гэтага патрабуе ЦК.

Зусім нездавальняюча пастаўлена марксісцка ленінскае выхаванне ў многіх партарганізацыях. Яшчэ мала такіх райкомаў, якія-б удумліва, па-партыйнаму засдухоўвалі кіраўнікоў пярвічных партарганізацый, дапамагалі-б ім у рабоце. Паказалі-б на месцы, як трэба перабудоўвацца.

Вельмі рэдкі яшчэ факты, калі выязджаючыя на месца таварышы з раёнаў практычна займаюцца пытаннямі, звязанымі з ажыўленнем унутрыпартыйнай работы.

І ў гэтай сувязі вельмі характэрным з'яўляецца тое гастралёрства, дзёртанне нізавых работнікаў і рада вых комуністаў, якое мела месца ў Шклове і Пухавічах. Там кожны прыезд раённых работнікаў заканчваўся масавым «збіваннем» Кіраўнікі райкомаў **(Шпак і Скараход)** не ўваходзілі ў глыб работы на месцы. Гэта верхаглядства, гастралёрскія наезды прынялі да таго, што партыйнай работы наогул не адчувалася.

Кіраўнікі не зразумелі таго, што стыль большэвіка — гэта чулыя і ўважлівыя адносіны да мас, што мы перабудоўваемся не дзеля перабудовы, а для таго, каб лепш, канкрэтней і аператыўней змагацца за выкананне нашых планаў. Вось чаму глыбока памыляюцца тыя кіраўнікі раёнаў, якія думаюць, што можна паспяхова змагацца за выкананне ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній, не перабудоўваючы ўсёй партыйна-масавай работы.

Іменна толькі тады поспех будзе забяспечан, калі ўнутрыпартыйная работа будзе перабудавана так, як гэтага патрабуюць рашэнне XVII з'езда, як гэтага патрабуюць задачы сёнешняга дня.

Партыйныя арганізацыі павінны сур'ёзна ўлічыць памылкі пухавіцкай і шклоўскай партарганізацый, павінны намеціць рад практычных мерапрыемстваў у сябе па перабудове партыйнай работы.

Партарганізацыі павінны ўзяць урокі з пастановы ЦК ВКП(б) аб становішчы гомельскай партарганізацыі, якая не перабударавалася так, як гэтага патрабуе XVII з'езд ВКП(б). А памылкі Пухавіч і Шклова ідуць па адной і той-жа лініі.

Ідэйнае згуртаванне партыйных радоў, барацьба за ўзняцце палітычнага ўзроўню комуністаў, праверка выканання, разгортванне самакрытыкі, аператыўнае кіраўніцтва і дапамога пярвічным партарганізацыям — вось, што павінна быць пастаўлена ў цэнтр увагі.

СПРАВА ШПІЁНСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

7—13 кастрычніка 1934 года выязная сесія ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюза ССР пад старшынствам **В. В. Ульрых,** з удзелам абароны і абвінавачання ў асобе нам. пракурора СССР **А. Іосель** разглядала ў Ленінградзе справу шпіёнскай арганізацыі.

Шпіёнская арганізацыя мела сваёй задачай збіранне вестак аб ваенна-морскіх сілах, ваеннай сілцы, аб заводах, што працуюць на абарону, аб становішчы параходнай гаспадаркі ў Ленінградскім і Мурманскім партах. Цэнтральнай фігурай шпіёнскай арганізацыі быў германскі грамадзянін **Фукс,** меўшы сваім бліжэйшым супрацоўнікам аўстрыйскага грамадзяніна **Котгасера,** працаваўшага ў якасці мантажнага тэхніка «Мурспабстроя» ў гор. Мурманску.

Перапіска паміж імі вялася шляхам прымянення тайнапісу адпаведнага кода і клічак замест подпісаў.

Шпіёнская арганізацыя, у якую быў завярбован таксама рад совецкіх грамадзян, разгарнула сваю работу па Ленінграду і Мурманску. Адным з галоўных агентаў па Ленінграду быў **Барцікоўскі,** як ў пачатку мая г. г. атрымаў ад Фукса і Котгасера заданне нанесці ўмоўнымі знакамі на план г. Ленінграда месцазнаходжанне вайсковых часцей, буйнейшых прадпрыемстваў абаронпага значэння, усіх авіяпаркаў, аэрадромаў, складаў гаручага.

Аналагічнае заданне Фукс даў чэхаславацкаму грамадзяніну **Каллетцу,** прапанаваўшы яму скласці эскізы месцараспалажэння ленінградскіх электрастанцый, газавых заводаў, вадаправодных станцый, як магчымых аб'ектаў паветранага нападу на выпадак вайны. Каллетц, замест выканання гэтага задання, паведаміў аб ім у III АДПУ пе ЛВА.

Вярнуўшыся ў Мурманск пасля сустрэчы з Фуксам Котгасер завербаваў для шпіёнскай работы ў горадзе Мурманску трох служачых «Мурспабстроя» совецкіх грамадзян ГРЫНФЕЛЬДА, ПЕТРОЎСКАГА і ГАЛУБЧЫКАВА, якія займаліся збіраннем розных сакрэтных вестак аб ваенным і грамадзянскім флоце ў Мурманскім парту.

У першай палове жніўня органамі наркамата ўнутраных спраў усе пералічаныя асобы былі арыштаваны, пры чым пры арышце Фукса, Котгасера і Барцікоўскага былі знойдзены шпіёнскія матэрыялы.

Пасля допыту падсудных і сведак, аналізу рэчавых доказаў суд прыгаварыў:

1) ФУКСА КУРТА па арт. 58-6 К. к.—к пазбаўленню волі на 8 год;

2) КОТГАСЕРА ГАНСА, па таму-ж артыкулу, к пазбаўленню волі на 6 год;

3) БАРЦІКОЎСКАГА П. П., як здрадніка радзіме, па арт. 58-1а К. к.,—к вышэйшай меры крымінальнага пакарання—РАССТРЭЛУ.

4) ПЯТРОЎСКАГА А. Я., 5) ГРЫНФЕЛЬДА П. К. і 6) ГАЛУБЧЫКАВА А. В., па таму-ж артыкулу, к пазбаўленню волі тэрмінам на 10 год кожнага.

Акрыча таго па справе былі прыцягнуты за недапасіцельства аб шпіёнскай дзейнасці Фукса і Котгасера совецкія грамадзяне МІХЕЛЬСОН А. Г. (асуджан на 1 год папраўча-працоўных работ) і МІХЕЛЬСОН-ГЕЙЛЬМАН А. Я. (па суду апраўдана). (БЕЛТА).

На тэмы дня

АБ ЛІКВІДАЦЫІ МАЛАГРАМАТНАСЦІ

На менскім заводзе імя Молатава 375 малаграматных рабочых. Ёсць на заводзе школа, працуючая на дзве змены. Для школы падабраны вопытныя настаўнікі, адведзены добра абсталяваныя пакоі. Словам, зроблена ўсё, што патрэбна—толькі вучыся. Але вучацца ўсяго 65 чалавек.

Бяда ўся ў тым, што зробленае—толькі фармальны бок справы. Па сутнасці-ж усеагульнае навучанне малаграматных зусім не забяспечана.

Школу адкрылі, а аб вучнях для яе не паклапаціліся. Тэхнічны дырэктар завода тав. Бунін, прызначаны загадчыкам школы, лічыць сябе адказным толькі за гаспадарку. Партком і комсамольскі камітэт не лічаць сябе адказнымі ні за што. Дырэктар тав. Карасік наогул стаіць у баку ад гэтай справы—памяшканне даў, чаго яшчэ, моў, трэба?—і ў выніку 310 малаграматных не навучаюцца і кожнаму з іх пагражае ператварэнне зноў у няграматных.

Каля 20 малаграматных работніц жывуць у рабочым пасёлку завода. Хадзіць на завод вучыцца яны не маюць магчымасці—хатняя гаспадарка, дзеці. Можна было-б арганізаваць іх на месцы, у пасёлку, накіраваўшы туды аднаго-двух настаўнікаў з падшэфных школ. Аднак:

—не будзем мы гэтай справай займацца,—заяўляе член парткома т. Сацэвіч.

Такія-ж адносіны да гэтай справы сустрэлі мы і на фабрыцы імя 8 сакавіка і ў трамвайным парку.

З першых дзён рэволюцыі наша партыя і савецкі ўрад упарта б'юць над павышэннем культурнага ўзроўню працоўных мас краіны. Добра вядома, як сур'ёзна ставіў Ленін пытанне аб граматнасці, як аб адным з важнейшых элементаў, забяспечваючых поспехі социялістычнага будаўніцтва. Добра вядома, што ператварэнне БССР у краіну суцэльнай граматнасці партыя ацэньвае, як перамогу сусветна-гістарычнага значэння.

Але адной граматнасці мала, — не раз гаварыў Ленін. На грунце пярвічнай граматы трэба рухаць далей справу аўладання працоўнымі масамі асновамі навук. І на сённешнім этапе школа малаграматных з'яўляецца для нас такім-жа баявым участкам, якім учора быў гурток лікпункт.

Вось гэтага не хочуць разумець на заводзе імя Молатава і ў многіх іншых мясцах. Пусціўшы на самацёк гэту справу, не арганізаваўшы пагалоўнага навучання малаграматных, людзі гэтыя абнажаюць фронт культурнай рэволюцыі на самым небяспечным участку.

І нават больш таго—рад сігналаў сведчыць аб тым, што вячэрнім школам ставяцца нават прамыя перашкоды.

Той-жа Бунін—загадчык школы завода імя Молатава—адмаўляецца плаціць грошы настаўніцы тав. Пашковіч. Хопіць, моў, аднаго пайка. Як толькі яна з'явілася на работу, Бунін пасылае яе ў цэх—вярбуй сабе вучняў. І вось хадзіла настаўніца па незнаёмых ёй цэхах, пакуль майстар не выгнаў. І гэта робіць той, каму даручылі арганізаваць школу і кіраваць ёю!

А з калгаса «Ударнік», Любаньскага сельсовета, Парыцкага раёна, настаўнік Мігай скардзіцца, што занятки з малаграматнымі зрываюцца з-за адсутнасці газы. Нарады на газу сельпо мае, але ніяк, «не збярэцца» прывезці.

Партыйныя арганізацыі на мясцах павінны чула прыслухоўвацца да такіх сігналаў, і, убіраўшы з дарогі тых, хто перашкаджае ліквідацыі малаграматнасці, забяспечыць большэвіцкае выкананне ленінскага завету.

ДА ХУІІ ГАДАВІНЫ ОКЦЯБРСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ.

„Наша Окцябрская рэволюцыя адкрыла новую эпоху сусветнай гісторыі" Ленін

АРМІЯ СУПРОЦЬ ВАЙНЫ, ЗА УЛАДУ СОВЕТАЎ

(1-8 кастрычніка 1917 г.)

... Пролетарскія рэволюцыянеры ўсю ўвагу накіроўвалі (пачынаючы са жніўня 1914 года) на рэволюцыянізаванне арміі, на скарыстанне яе супроць імперыялістычных разбойнікаў буржуазіі, на ператварэнне несправядлівай і грабежніцкай вайны паміж двума групамі імперыялістычных драпежнікаў у справядлівую і законную вайну пролетарыяту і прыгнечаных працоўных мас кожнай краіны супроць «сваёй», «нацыянальнай» буржуазіі (Ленін т. XXIV, стар. 636).

«...у арміі большэвікі таксама мелі ўжо к лістападу 1917 г. палітычны «ударны кулак», які забяспечваў ім падаўляючую перавагу сіл у рашаючым пункце ў рашаючы момант. Ні аб якім супраціўленні з боку арміі супроць Окцябрскай рэволюцыі пролетарыята, супроць заваявання палітычнай улады пролетарыятам не магло быць і гутаркі калі на паўночным і заходнім франтах у большэвікоў была гіганцкая перавага (падкрэслена намі.—Рэд.), а на астатніх франтах, аддаленых ад цэнтра, большэвікі мелі час і магчымасць адваяваць сялян у эсэраўскай партыі». (Ленін, т. XXIV, стар. 638).

Па-першае, Окцябрская рэволюцыя мела за сабой актыўнейшае падтрыманне аграмадной большасці рабочага класа Расіі.

Па-другое, яна мела несумненнае падтрыманне сялянскай беднаты і большасці салдат, жадаўшых міру і зямлі.

Па-трэцяе, яна мела на чале, у якасці кіруючай сілы, такую выпрабаваную партыю, як партыя большэвікоў, моцную не толькі сваім вопытам і кадрамі выпрацаванай дысцыплінай, але і аграмадными сувязямі з працоўнымі масамі...

(СТАЛІН. «Вопросы ленинизма». «Октябрьская революция и тактика русских коммунистов», 1932 г., ст. 76-77).

Пачатак кастрычніка 1917 г. Пасля карнілаўскіх дзён уплыў большэвікоў у арміі і флоце ўсё больш і больш павялічваецца. Армейскія часці адна за другой выказваюцца з-пад уплыву меншавікоў і эсэраў. Салдацкія масы пасылаюць сотні дэлегатаў ад дывізій, палкоў, рот і т. д. у Петраград—у большэвіцкі ЦК і Петраградскі совет—з запэўненнямі ад сваёй адданасці большэвіцкай партыі і Советам, са сваімі наказамі і рэзалюцыямі. Лейтматывам усіх іх былі патрабаванні: 1) палітыка міру, 2) спыненне палітыкі рэпрэсій супроць большэвікоў, 3) падтрыманне большэвіцкіх газет, 4) стварэнне ўрада, адказнага перад Советамі, 5) пераход улады да Советаў.

На тэрыторыі Беларусі (на Заходнім фронце) у гэты час таксама расце большэвіцкая работа ў армі, растуць франтавыя большэвіцкія арганізацыі, растуць большэвіцкія настроі, пачынаючыя выпадкі братання.

Сёння прыводзім дакументы, якія адлюстроўваюць настроі арміі на Заходнім фронце) у пачатку кастрычніка 1917 года.

РЭЗАЛЮЦЫЯ

1 кастрычніка, Менск. Агульны сход салдат №-скай армейскай пачынаючай артылерыйскай майстэрні... на пасяджэнні сваім 18 верасня 1917 года прыняў аднагалосна наступную рэзалюцыю:

Выходзячы з гістарычнага фазіса развіцця рэволюцыі патрабуем у імя выратавання, расшырэння і ўмацавання яе:

1) перадачы ўсёй улады Советам Салдацкіх, Рабочых і Сялянскіх дэпутатаў, як выражальнікам волі дэмакратыі большасці насельніцтва Расіі; 2) адмены кары смерцю; 3) неадкладна прыступіць да перагавораў аб міры з усімі ваюючымі і нейтральнымі дзяржавамі на платформе інтэрнацыянальнага социялізма...

4) Стварыць паўсямесна Чырвоную гвардыю...

(«Молот», № 9, 1917 г.).

МЕНСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ РСДРП (большэвікоў)

3 кастрычніка Ад імя 3-й роты №-га сапёрнага батальёна шлем прывітанне Менскай арганізацыі РСДРП, як прадстаўніцы адзіных барацьбітоў дэмакратыі і лічым, што толькі такія арганізацыі могуць выратаваць свабоду і рэволюцыю і прывесці да светлага будучага жыцця.

Пры гэтым перасылаем у рэволюцыйны фонд 45 руб. 65 кап. тав. Смірновым.

Старшыня Р.К.О. ГРОМАЎ.
Сакратар В. ЧАЛНОЎ.
(«Молот», № 5, 1917 г.).

4 кастрычніка. г. Гомель. На размеркавальным пункце, дзе сабралася каля 8.000 салдат, апошнія адмовіліся ісці на фронт. У гэты час С.Р. і С.Д. адхілілі рэзалюцыю, прапанаваную большэвікамі аб вайне і міры. Салдаты акружылі памяшканне Совета і прымусілі Совет прыняць большэвіцкую рэзалюцыю супроць вайны.

(«Новое варшавское утро», 24 IX 1917 г.).

СА ЗВОДАК ШТАБА АРМІІ ЗА ОДНЯГА ФРОНТА АБ НАСТРОЯХ ВОЙСК У ЧАСЦЯХ АРМІІ ЗАХОДНЯГА ФРОНТА

9-ы АРМЕЙСКІ КОРПУС.

Пачатак кастрычніка 1917 г. Агульны настрой часцей корпуса значна пагоршыўся. Недавер'е да афіцэраў узмацняецца. Павялічваецца інтарэс да вучэння большэвікоў... Дывізія ахоплена адным імкненнем хутчэйшага заключэння міру.

15-й Сібірскай дывізіі... зварачае на сябе ўвагу павелічэнне ліку салдат, прызнаючых сябе прыхільнікамі большэвікоў».

1-ы СІБІРСКІ КОРПУС.

Па думцы камандзіра корпуса боездольнасць войск нястрымна падае... большэвіцкая агітацыя і друк, у прыватнасці газета «Молот», распальваюць варожасць салдат у адносінах афіцэраў...

ГРЭНАДЗЕРСКІ КОРПУС.

У настроі салдат грэнадзерскага корпуса за прайшоўшы тыдзень заўважана пагоршанне... Велізарным поспехам карыстаецца агітацыя большэвікоў, на большай частцы падпольная, заклікаючая да невыканання загадаў, да неадкладнага сканчэння вайны і да недавер'я камандніаму складу да вярхоўнага галоўнакамандуючага ўключна.

9-ы АРМЕЙСКІ КОРПУС.

...Большэвізм прадаўжае расці, уцягваючы за сабой цэлыя часці, якія вызначаліся раней дысцыплінаванасцю. Напрыклад, вучэбныя каманды, а ў 5-й дывізіі інжынерныя роты...

...Рэзкім дысанансам армейскага друку, а таксама органаў сталічнай, гарадской і іншай прэсы гучаць артыкулы і заклікі органа менскіх большэвікоў «Молота» і прымыкаючых да яго напрамку «Известий» Менскага СС і РД, у асаблівасці першага. У кожным нумары «Молота» чуюцца непрымірымыя заклікі да барацьбы з усім, што не з ім.

З. п. генерал-квэрцімейстра штаба галоўнакамандуючага арміямі Заходняга фронт палкоўнік МАЛЯВІН.
Час. в. п. начальніка асобага аддзялення—капітан (подпіс).
(Архіў Гістпарта пры ЦК КП(б)Б 21, № 10).

Інстытут гісторыі партыі і Окцябрскай рэволюцыі пры ЦК КП(б)Б

ЗАКУПКІ ХЛЕБА

„ЗАГОТЗЯРНО" І КААПЕРАЦЫЯ СПРАЧАЮЦЦА, А ЗАКУПКІ ПРАВАЛЬВАЮЦЦА

Чавускі раён абавязаўся закупіць 1.400 тон хлеба—1.000 тон райспажыўсаюз і 400 тон «Заготзярно».

«Заготзярно» замест таго, каб паслаць сваіх працаўнікоў у сельсоветы для правядзення масавай работы серод калгаснікаў і аднаасобнікаў, займаецца захватніцкімі тэндэнцыямі.

Не гледзячы на неадпаразовыя папярэджанні РК КП(б)Б, «Заготзярно» прадаўжае перахватваць хлеб, куплены кааперацыяй.

Сельпо Радамскага, Хапетаўскага, Асінаўскага, В. Елогаўскага сельсоветаў прывезлі закуплены імі хлеб для здачы на пункт «Заготзярно». Работнікі пункта заявілі: «Гэты хлеб уваходзіць у план «Заготзярно», а ў план кааперацыі мы яго не запішам. І работнікі пункта без дай прычыны парвалі пуцёўкі сельпо.

Не гледзячы на просьбы райспажыўсаюза, сельпо і саміх калгаснікаў, райкантора «Заготзярно» ніякіх мер не прымае да сваіх работнікаў. Ёсць выпадкі, што хлеб, які прывозіць сельпо, на пунктах не прымаюць, кажучы што ён засмечаны. Калі-ж гэты самы хлеб быў перакладзен на другія падводы і здан не як ад сельпо, а ад імя аднаасобнікаў, ён быў прынят (Сушчэўскае сельпо).

Падобныя агіднасці творацца на кожным кроку. Калгаснікаў, якія вязуць хлеб, закуплены сельпо, прымушаюць чысціць яго. Калгаснікі вымушаны варочацца з хлебам назад. Бывае і так, што калгаснікі не жадаюць гнаць падводы назад, здаюць хлеб, які закупіла сельпо ў лік закупак, зробленых «Заготзярно».

Мы лічым, што пракуратура рэспублікі павінна заняцца гэтымі фактамі. Канкурэнцыі, антаганізму паміж работнікамі «Заготзярно» і райспажыўсаюза не павінна быць. Пельга цярпець такога становішча, калі замест канкрэтнай дзелавой работы займаюцца склокамі, спрэчкамі.

Упаўнаважаны закупхлеба па Чавускаму раёну ГАЎДЫЦКІ.
Упаўнаважаны БКС ЦЁМКІН.

У ГОНАР З'ЕЗДА РАБСЕЛЬКОРАЎ

Па ініцыятыве селькораў калгаса «Большэвік», Верайцоўскага сельсовета (Асінавіцкі р.) 18 кастрычніка быў арганізован чырвоны абоз імя III усебеларускага з'езда рабселькораў. Прадана 6 тон. Калгас «Большэвік» выклікаў на спаборніцтва астатнія калгасы раёна.

ГАСМАН.

Калгас «Чырвоная зорка» мае валікую насеку ў 57 вулляў. Пчалярства пачалося ў 1930 годзе з 16 вулляў. У гэтым годзе выдаецца па 17 грам меду на працадзень. Так, напрыклад, ударніца Саня Шапіра з сям'ёй атрымала 9 кгр. 900 грам на свае 587 працадзён. На здымку: закладка зімовага падкорму ў вулей.

Тав. ДЗІМІТРАЎ АБ ПЛЕБІСЦЫЦЕ У СААРСКАЙ ВОБЛАСЦІ

ПАРЫЖ, 17 кастрычніка. (БЕЛТА). Комуністычная «Арбейтэр цэйтунг», якая выходзіць у Саарбрукене, апублікавала інтэрв'ю т. Дзімітрава з карэспандэнтам газеты. Тав. Дзімітраў заявіў: «Вядома, што комуністы не лічаць, што статус-кво з'яўляецца канчатковым вырашэннем пытання для Саарскай вобласці і саарскага насельніцтва. Комуністы за поўнае вызваленне саарскага насельніцтва, а таксама за ўстраненне якога-б там ні было рэжыму ўрадавай камісіі Лігі нацый. Але зараз справа стаіць так, што саарскае насельніцтва можа выбіраць адну з двух магчымасцей: або галасаваць за статус-кво, або за далучэнне к фашысцкай Германіі. Трэцяй магчымасці ў сучасны момант не існуе. Саарская вобласць — гэта нямецкая краіна, і павінна астацца нямецкай. Саарскія жыхары заўсёды будуць за аб'яднанне з германскім народам, аднак яны ажыццёвяць гэта далучэнне толькі ў той момант, калі гэта будзе ў супраўдных інтарэсах Германіі і Саара...

Але зараз далучэнне Саарскай вобласці да Германіі азначала-б, што Саар падпаліцца панаванню фашысцкай Германіі. Утоесамляць цяперашні фашысцкі рэжым у Германіі з германскім народам — гэта велізарнае глупства... Калі-б германскі народ меў магчымасць свабодна выказаць тое, што ён думае і чаго ён жадае для Саарскай вобласці, то ён мільён раз крыкнуў-бы свету: «Саарскія браты, падалей ад фашысцкай Германіі».

«Кожны голас за далучэнне да фашысцкай Германіі — гэта голас, паданы супроць германскага народу, голас за падаўленне працоўных мас. Бо калі-б Гітлер меў поспех у Саары, то гэта заахвочвала-б яго да яшчэ больш невыноснага падняволення і эксплаатацыі германскага народу, гэта было-б далейшым заахвочваннем для фашысцкіх падбухторшчыкаў вайны. І наадварот: паражэнне германскага фашызма ў Саары будзе азначаць магутны ўдар супроць фашызма не толькі ў Германіі...»

ПАД НАЦІСКАМ МАС ГЕРМАНСКІ УРАД ХІСТАЕЦЦА ПАЧАЎ ПРАЦЭС ТЭЛЬМАНА

ЛОНДАН, 19 кастрычніка. (БЕЛТА). «Дэйлі уоркер» паведамляе, што згодна даставерных вестак з Берліна германскі ўрад, з прычыны грамадскага абурэння за граніцай і ўнутраных палітычных затрудненняў, хістаецца пачаць працэс Тэльмана, хоць папярэдняе следства закончана і абвінаваўчы акт складзен.

Міжнародны камітэт дапамогі ахвярам германскага фашызма стварыў юрыдычную камісію з прадстаўнікоў 8 краін, якая збіраецца неадкладна, калі германскі ўрад раптоўна вырашыць пачаць працэс Тэльмана.

***

ЛОНДАН, 19 кастрычніка. (БЕЛТА). Берлінскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе, што паводле вестак з кампетэнтных колаў, працэс Тэльмана будзе весціся публічна перад новым судом на аснове артыкулаў 83 і 86 крымінальнага кодэкса, згодна якіх абвінаваўчы прыгавор цягне за сабой турэмнае зняволенне ці катаржныя работы.

ДЗЕЙНАСЦЬ НАЦЫЯНАЛ-СОЦЫЯЛІСТАЎ У ЗША

НЬЮ-ІОРК, 19 кастрычніка. (БЕЛТА). Парламенцкая камісія, якая абследуе дзейнасць нацыянал-соцыялістаў у ЗША, выявіла пісную сувязь паміж германскімі дыпламатычнымі і консульскімі органамі Злучаных Штатаў і мясцовымі нацыянал-соцыялістскімі арганізацыямі. Высветлілася, што германскае консульства субсідзіравала антысеміцкую прапаганду. Згодна паказанняў, германскі пасол Лютэр субсідзіраваў выданне нацыянал-соцыялістцкага памфлета.

Некалькі сведак, займаўшых відныя пасты ў нацыянал-соцыялістцкіх арганізацыях у ЗША, паказалі, што германскі ўрад падтрымлівае прапаганду і шпіянаж у ЗША і што нацыянал-соцыялістцкія штурмавікі пераходзяць у ЗША ваенную падрыхтоўку.

Прысутныя на пасяджэнні нацыянал-соцыялісты наладзілі пры гэтым дэманстрацыю і сталі выкрыкваць: «Няхай жыве Гітлер» і т. д. і перарэзалі правады ад мікрафона, каб перашкодзіць перадачы па радыё паказанняў сведак. Пасяджэнне камісіі прышлося спыніць.

На вуліцах Мадрыда

На здымку: паліцыя абшуквае «падазронага» прахожага.

У АБАРОНУ ІСПАНСКАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА

ЗАКЛІК ДАЦКАЙ ПРОФСАЮЗНАЙ АПАЗІЦЫІ

СТАКГОЛЬМ, 19 кастрычніка. (БЕЛТА). У Капенгагене адбылася канферэнцыя дацкай профсаюзнай апазіцыі. На канферэнцыі было прадстаўлена 97 профсаюзаў, якія яднаюць 55 тыс. арганізаваных рабочых. Канферэнцыя прыняла рэзалюцыю, у якой вітае гераічную барацьбу іспанскага пролетарыята. «Мы заклікаем,—сказана ў рэзалюцыі, — дацкі рабочы клас к абароне таварышоў па класу, якія змагаюцца ў фашысцкіх краінах, і асабліва к салідарнаму падтрыманню барацьбы іспанскага пролетарыята».

Пасля марсельскіх забойстваў

ТЭРАРЫСТЫ—АГЕНТЫ ГЕРМАНСКАГА ФАШЫЗМА

ВЕНА, 19 кастрычніка (БЕЛТА). Белградскія палітычныя колы падкрэсліваюць існаванне цяснейшага супрацоўніцтва паміж харвацкімі і македонскімі фашыстамі. Канчаткова ў таноўлена, што забойца караля Александра і Барту — член македонскай фашысцкай арганізацыі Міхайлава—Георгіеў працаваў у якасці «інструктара» ў радах харвацкай фашысцкай арганізацыі «Усташа». Трэба ў сувязі з гэтым напомніць, што правадыр «Усташа» быўшы дэпутат горада Загрэба ў скупчыне Павеліч эміграваў пасля агалашэння ваенна-фашысцкай дыктатуры з Югаславіі ў 1929 г. у Балгарыю і ў далейшым заочна прыгавораны белградскім судом да кары смерцю. Пры сваім прыездзе ў Балгарыю Павеліч быў спаткан у Сафіі македонскімі фашыстамі ўрачыстымі маніфестацыямі.

Паміж Павелічам і фашысцкім македонскім нацыянальным камітэтам было тады падпісана і апублікавана пагадненне аб сумеснай барацьбе. Трымалася, разумеецца, у сакрэце пагадненне аб сумеснай тэрарыстычнай дзейнасці і аб сувязях з рэвізіяністцкім фашысцкімі арганізацыямі за граніцай; аднак, гэта сумесная дзейнасць выражалася ў сумеснай падрыхтоўцы раду замахаў на ўрадавыя будынкі, чыгункі і відных урадавых дзеячоў Югаславіі.

Падкрэслваецца далей, што невыпадкова інструктарам «Усташа» быў назначан Владзімір Георгіеў, які забіў у 1924 годзе відная правадыра македонскіх нацыянальных рэволюцыянераў, комуніста і дэпутата рабочай партыі ў балгарскім парламенце Хаджы—Дзімава.

Белградскія палітычныя колы ўказваюць, што супрацоўніцтва харвацкіх і македонскіх фашыстаў умацоўвалася яшчэ тою акалічнасцю, што яны разам сталі агентамі рэвізіяністцкіх фашысцкіх колаў за граніцай, у прыватнасці Венгрыі і Германіі. Яны разам сталі адкрытымі агітатарамі нацыянал-соцыялізма і стараліся накіраваць харвацкі і македонскі рух у русло рэвізіяністцкага фашызма.

„ГЕРМАНСКІЯ КОЛЫ—НАТХНІЦЕЛІ ЗАБОЙСТВАЎ

РЫМ, 19 кастрычніка. (БЕЛТА). «Газета даль пополо» лічыць германскія колы натхніцелямі марсельскіх забойстваў. Газета падкрэслівае, што замах быў зроблен у момант, калі французскі ўрад збіраўся разлумачыць Александру новую палітычную абстаноўку і рыхтаваўся к пагадненню з Італіяй. Газета адзначае, што ўскладненні з прычыны марсельскай бойні, падвяргаючы небяспецы ўсю праробленую да сучаснага моманту работу па ўмацаванню міру і па італа-французскаму збліжэнню, былі асабліва пажаданымі Германіі, якая магла-б спакойна завяршыць сваю ваенную падрыхтоўку.

ПРАВАКАЦЫЙНАЯ ЗАЯВА ГЕРЫНГА

ЛОНДАН, 18 кастрычніка. (БЕЛТА). У інтэрвью, даным у Белградзе карэспандэнту «Дэйлі мейль», Герынг, між іншым, зрабіў вельмі характэрную і сімптаматычную заяву.

Гаворачы аб удзельніках забойства караля Александра, ён заявіў, што «іх дзеянні прадстаўляюць сабой адно з праяўленняў большэвіцкай смуты». Паводле слоў Герынга, паліцыя паведаміла яго, што Дзімітраў, які знаходзіцца ў СССР, паслаў, паводле маючыхся даных, людзей для таго, каб зрабіць замах на яго, Герынга, у Белградзе. Магчыма,—прадаўжаў Герынг, — што гэта праўда, але само паведамленне сімптаматычна.

***

Лідэры германскага фашызма, як вядома, выбралі сваёй спецыяльнасцю выступаць ад часу да часу з заявамі, якія здзіўляюць увесь свет. Па сваёй фантастычнасці яны астаўляюць далёка ззаду вяломага барона Мюнхгаўзена, роданачальніка арыйскіх хлусоў, паўры якога даўным даўно паблеклі ў параўнанні з вымысламі яго фашысцкіх патомкаў. З другога боку, у выказваннях фашысцкіх підэраў яўна адчуваецца брэд, які носіць акраслена паталагічны характэр.

Мы не будзем даваць такой суровай ацэнкі данай заяве Герынга. Як відаць, ён знаходзіўся ў цвёрдым розуме і здаровай памяці. Выступленне-ж яго аб тым, што марсельскія забойствы прадстаўляюць сабой «адно з праяўленняў большэвіцкай смуты», і аб тым, што тав. Дзімітраў нібыта «паслаў людзей у Белград, каб зрабіць замах на Герынга» прадыктавана вельмі зразумелымі меркаваннямі. Г-н Герынг вельмі заклапочан выкрыццямі сусветнага друку аб тым, што штаб «Усташы» знаходзіўся ў Берліне пад высокай апекай нацыянал-соцыялістцкай партыі. Г-ну Герынгу хацелася-б перакрасліць неабвержныя факты, якія гавораць аб тым, што «Усташы» не толькі карысталіся ласкавай гасціннасцю сучасных улядароў Германіі, але і атрымлівалі ўсямернае падтрыманне, як атрымоўваюць яго рускія белагвардзейцы з «РОНДА» і украінскіх белагвардзейцы з банды палкоўніка Канавальца, «атамана» Скарападскага і т. д.

Г-ну Герынгу, прыбыўшаму ў Белград, каб выказаць ад імя германскага фашызма «шчыры жаль» па поваду смерці югаслаўскага караля, паўшага ад пуль «Усташы», вельмі хацелася-б адмежавацца ад марсельскіх тэрарыстаў. І ён пускаецца на новую дыверсію. Дарэмныя стараннi.

Бессаромнасць Герынга цалкам адпавядае яго труднаму становішчу ў Белградзе. Нічога, аднак, дзіўнага ў паводзінах фашысцкага сановніка няма: правакацыя — старая выпрабаваны сродак германскага фашызма, а заява Герынга—ні шчырая, ні прадвазіцельная, ні шчырая, ні прадвазіцельная. Аднак, наўрад ці ўдадзе гэты... неўр каго-небудзь у заблуджэнне. Выступленне Герынга... германскі фашызм імкнецца... стаць марсельскія забойствы... таго, каб унесці нябгоду ў лагер змагаючыхся за мір. Тэзісы... мэта заявы незадачлівага фашыстага ваяжэра.

(«ПРАВДА»).

ДАСЯГНЕННІ БЕЛАРУСКАЙ МАШЫНА-ДАСЛЕДЧАЙ СТАНЦЫІ

ЦК КП(б)Б—т. т. Гікало і Валковічу, СНК БССР—т. Галадзеду, НКЗБ—т т. Бенеку і Ратнеку

Калектыў навуковых работнікаў і рабочых беларускай машына-даследчай станцыі рапартуе ў вашай асобе партыі і ўраду аб паспяховым вырашэнні раду першаступенных праблем у галіне механізацыі социялістычнай сельскай гаспадаркі, праблем, маючых усесаюзнае значэнне.

Намі распрацавана, спрабіраваны і пушчана ільнотрапалка сістэмы Гарлачова, заняўшая на Усесаюзных іспытаннях першае месца. Ужо ў гэтым годзе адна толькі Маскоўская вобласць выпусціла 1.500 штук, БССР — 500 штук, Заходняя і інш. вобласці таксама вырабляюць ільнотрапалку Гарлачова.

Распрацаван канавакапацель па тыпу Кіліфер 107, які працуе не толькі на мінеральных глебах, але і на балотах. Канавакапацель з'яўляецца лепшым з усіх існуючых. Прадукцыйнасць канавакапацеля 10 клм. канаў у рабочы дзень з шырынёй зверху ў 125 см. глыбінёй—90 см., шырынёй дна — 25 см.

Спешна распрацоўваюцца чарцяжы для здачы канавакапацеля ў масавую вытворчасць. Эксперыментальны ўзор паступіў у гаспадарчае выкарыстанне Менскай МТС.

Распрацован і выпрабаван бульбяны камбайн, вырашаючы за адзін праход у баразне аддзяленне бульбяніку ад зямлі і клубняў бульбы і вылас яе ў бок, адсейванне зямлі і транспартаванне чыстай бульбы ў бункер.

Па заяве прадстаўніка Усесаюзнага бульбяпрага інстытута, праблема аддзялення бульбяніку ніадзін нікім даваўшай магчымасці вырашэння здавальняючага бульбянаўборачнага камбайна.

Работа над гэтай праблемай у капіталістычных краінах не ўвянчалася поспехам.

Важнасць праблемы аддзялення бульбяніку ўперадзе лемяха заключаецца не толькі ў тым, што астатнія працэсы, якія робіць машына, вырашаюцца вельмі проста, але і ў тым, што ўдаленне бульбоўніку ўперадзе лемяха папярэджвае заражэнне клубняў бульбы фітафторай, што атрымліваецца пры датыканні з заражаным бульбянікам пры ўборцы. Апрача таго гэта дало магчымасць нам звесці да мінімума—да 1 проц.—раненне бульбы.

З 20 кастрычніка прыступаем к згатаўленню вытворчых чарцяжоў для выпуску першай партыі машын к сезону 1935 года.

Адначасова распрацавана конная бульбакапалка, укладваючая выкапаную бульбу ў радок услед за сабой.

Апрабіраван і пушчан балотны плуг сістэмы Фоміцэва, вырашаючы механізацыю пярвічнай апрацоўкі балотных зямель. Ён з'яўляецца лепшым з усіх наяўных плугоў заграничных канструкцый.

Распрацаваны аўтаматы Эрдмана для плугоў АД-8 і АТ-8, вырабляемыя беларускімі заводамі.

Распрацавана новая канструкцыя шпор для трактароў, якія павінны павысіць да 20 проц. карыснае цягавае намаганне трактара, што мае асаблівае значэнне пры ранніх веснавых работах трактара.

Праведзена вялікая работа па асваенню зернакамбайнаў ва ўмовах БССР на ўборцы жыта, ячменю, аўса, пшаніцы і лубіну.

Наперакор нацдэмаўскім сцвярджэнням аб непрыгоднасці камбайнаў ва ўмовах БССР, нашым іспытаннем даказана, што зернакамбайн ва многіх раёнах, соўгасах і калгасах Беларусі прымянім.

Асаблівым пацвярджэннем гэтага доказу можа служыць работа камбайна ў гаспадарчых умовах соўгаса Чачэвічы, дзе камбайн працаваў на зернавых культурах і ўбрана таксама лубіну на насенне звыш 60 гектараў.

Прадукцыйнасць камбайна на лубіне даходзіла да 11 га ў дзень.

Вялікую работу праводзім і заканчваем к канцу гэтага года па распрацоўцы зернасушылкі для соўгасаў і калгасаў.

Распрацавана і заканчваецца пабудова наземных дарог для механізацыі скотных двароў жывёлагадоўчых ферм соўгасаў і калгасаў. Праводзіцца работа па ўкараненню ветрарухавікоў для водаснабжэння і электрыфікацыі соўгасаў і калгасаў.

Нашы поспехі не з'яўляюцца выпадковасцю. Гэта перш за ўсё рэзультаты большэвіцкага кіраўніцтва і ўвагі, якія мы маем з боку ЦК партыі і ўрада БССР.

У асобе тт. Валковіча і Бенека мы маем жывое штодзённае кіраўніцтва і падтрыманне ва ўсёй работе.

Ваша давер'е к нам, маладым спецыялістам, скончыўшым совецкія ВНУ і ВТНУ, падтрыманне, кіраўніцтва ўсялілі надзею і энтузіязм у работе. Змагаючыся супроць ахвосця нацдэмаўшчыны і расхлябанасці, дабіўшыся высокай дысцыпліны і на аснове прымянення ў навукова-даследчай рабоце марксісцка-ленінска-сталінскай метадалогіі, мы вырашылі некаторыя праблемы, над якімі працавала капіталістычная тэхніка дзесяцігоддзяў, на працягу аднаго года. Гэта дало нам права выйсці ў перадавыя рады навукова-даследчых арганізацый Саюза.

Нашы поспехі ў галіне механізацыі сельскай гаспадаркі не могуць супакоіць нас ні на адну мінуту, а наадварот абавязваюць яшчэ з большай энергіяй, з большым энтузіязмам працаваць надалей з тым, каб даць лепшае афармленне новым машынам і ў асаблівасці бульбяному камбайну, каб даць першую партыю машын к будучаму году.

Нам неабходна зараз, як ніколі, узяцца за асваенне і ўкараненне машын, выпускаемых совецкімі заводамі, у калгасах і соўгасах, бо да гэтага часу работа гэта намі як след не ахоплена.

Работа прадстаіць па прасоўванню новых машын у вытворчасць. Але, маючы цвёрдае большэвіцкае кіраўніцтва, ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало, задачы, што стаяць перад намі, будуць выкананы.

Дырэктар станцыі МАЦЕПУРА.
Парторг ШОРЭЦ.
Мясцком МАЗУРКО.

ВЫТВОРЧЫ ПАХОД ІМЯ VII УСЕСАЮЗНАГА І XI УСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДАЎ СОВЕТАЎ

ШЫРЫЦЦА КАЛГАСНЫ ПРЫЛІЎ

У сувязі з падрыхтоўкай да перавыбараў советаў у Падгайскім сельсавеце, Менскага раёна, разгорнута работа па арганізацыі прыліву ў калгасы.

На сходах калгаснікаў і аднаасобнікаў прапрацаван артыкул тав. Гікало «Новыя хвалі калгаснага прыліву», змешчаны ў «Правде», а таксама звароты ЦВК СССР і БССР аб перавыбарах советаў. На сходах актыўна выступалі прадстаўнікі калгасаў, актыў і ўдарнікі і адзначалі поспехі, дасягнутыя ў справе ажыццяўлення ўказанняў таварыша Сталіна — зрабіць калгасы большэвіцкімі і ўсіх калгаснікаў заможнымі.

У рэзультаце ў калгасы сельсавета ўступіла 90 двароў аднаасобнікаў. Першае месца па арганізацыі прыліву заваяваў старшыня калгаса імя ЦК КП(б)Б тав. Андрыеўскі. Ён уцягнуў у свой калгас 17 двароў. У калгас «БелАН» уступіла 15 двароў, у калгас імя 1 з'езда калгаснікаў— 14 двароў.

Але трэба адзначыць недастатковую работу па арганізацыі прыліву на тэрыторыі калгаса «Чырвоныя Скарынічы» (старшыня тав. Калнін) і калгаса «Чырвоны партызан» (старшыня калгаса т. Бейнін). У гэтых калгасах налічваецца ад 20 да 32 аднаасобных гаспадарак, а прынята ў калгасы ўсяго 6 двароў. **Л. МАЕЎСКІ.**

ЗА КУЛЬТУРНЫ РАЁННЫ ЦЭНТР

(Ад палескага карэспандэнта «Звязды»).

Уключыўшыся ў вытворчы паход імя VII усесаюзнага і XI усебеларускага з'ездаў советаў, Петрыкоўскі горсовет узяў рад абавязацельстваў. За самаабавязацельствамі паследвала практычная работа.

На вуліцах Петрыкава вясной і ўвосень нельга праехаць. Лужыны, гразь. Горсовет рашыў пакончыць з такім становішчам. Дарожная секцыя горсовета правяла сходы жыхароў. На сходах пастанавілі, каб кожны домаўласнік адпрацаваў на дарожным будаўніцтве без каня 6 дзён, а з канём 4 дні.

Закіпела работа. Палова вуліц прыведзена ўжо ў парадак. Выбоіны забіваюцца ламаччом, шчэбнем і засыпаюцца зямлёй. Цэнтральная вуліца забрукавана добра выпаленай цэглай накшталт клінкера.

У горадзе не было добрай гасцініцы. Пасажыры начавалі ў поўраскіданым доме. Зараз гэты дом капітальна рамантуецца. Гасцініца абсталёўваецца добрымі ложкамі і мэбляй. Заканчваецца будаўніцтва новай гарадской лазні.

Не было ў горадзе і добрага кінотэатра. Горсовет рашыў прыстасаваць пад тэатр пустую закрытую царкву. Былая царква ўжо адрамантавана і прыстасавана пад кінотэатр на 500 чалавек.

Вялікіх поспехаў горсовет дабіўся і ў выкананні фінплана. Заданні I і II кварталаў перавыкананы. План 3 квартала выканан на 137 проц. Горсовет абавязаўся выканаць да окцябрскіх свят фінансавы план IV квартала не менш, чым на 50 проц. **ФРАЛОЎ.**

У Камісіі Партыйнага Кантроля

АБ РАБОЦЕ ВОДНАГА ТРАНСПАРТА

Камісія Партыйнага Кантроля зрабіла праверку выканання Верхня-Волжскім параходствам пастановы ЦК ВКП(б) і Саўнаркома СССР аб планаванні перавозак і паляпшэнні работы воднага транспарта. Аказалася, што гэта дырэктыва партыі і ўрада Верхня-Волжскім параходствам у належнай меры не выканана.

Да гэтага часу яшчэ мае месца спазненне дачы месячных планаў прыстаням і суднам на 10 і больш дзён. Парэйсавыя заданні і загады па Верхня-Волжскаму параходству носяць фармальны характар. Парушаецца першачарговасць перавозак транзітных грузаў першай катэгорыі. Не заўважаецца патрэбнага зруху ў павышэнні скарыстання танажу і скарачэнні прастояў суднаў.

Так, напрыклад, за 3 месяцы на ст. **Рыбінск** 126 суднаў прастаялі ў вогуле 1.299 судна-сутак звыш нормы; ёсць залежы дэфіцытных грузаў. На прыстані **Горкі** 340 тон грузаў праляжалі ад 70 да 100 дзён. Дысцыпліна сярод каманднага складу суднаў па-ранейшаму знаходзіцца на нізкім узроўні. Аварыйнасць прадаўжае аставацца высокай і паранейшаму каля 60 аварый адбываюцца па віне плаўскладу.

З боку Волжска-Камскага ЦУРТа (т. Чэвердзін) мае месца зніжэнне месячных планаў перавозак і скарыстання механізмаў.

Бюро Камісіі Партыйнага Кантроля, разгледзеўшы гэтае пытанне, паставіла на від начальніку Верхня - Волжскага параходства т. Галаванаву і начальніку Волжска-Камскага ЦУРТа т. **Чэвердзіну** непрыняцце дастатковых мер к выкананню вышэйуказанай пастановы ЦК і Саўнаркома.

Бюро КПК папярэдзіла нам. нач. Верхня-Волжскага параходства тав. **Куўшынава**, што калі ён не даб'ецца ў найкарацейшы тэрмін паляпшэнняў у эксплаатацыі суднаў, то будзе знят з работы і аддан пад суд.

Наркамводу т. **Пахомаву** прапанавана за невыкананне парэйсавага загаду зняць з работы з пераводам на ніжэйшую пасаду капітана парахода «Роза Люксембург» Герасімава.

Пракурору Саюза т. **Акулаву** прапанавана прыцягнуць да крымінальнай адказнасці найбольш злосных віноўнікаў апрамадных прастояў танажу пад пагрузкай і выгрузкай па прыстанях Горкі і Рыбінск.

Пракурору воднага транспарта т. **Янскаму** ўказана на слабае выкананне пракуратурай дырэктывы ЦК і СНК аб матэрыяльнай і крымінальнай адказнасці за прастоі танажу і прапанавана ўмацаваць кіраўніцтва пракуратуры па Верхня-Волжскаму параходству.

МЕЛЕХАЎ

ЗА СІСТЭМАТЫЧНУЮ, ГЛЫБОКУЮ РАБОТУ СА СПАЧУВАЮЧЫМІ

Перамогі социялізма ў нашай краіне, маючыя сусветна-гістарычнае значэнне, яшчэ больш высока ўзнялі аўтарытэт і ўмацнілі любоў да натхняльніка і арганізатара гэтых перамог—комуністычнай партыі. Адзін з яркіх паказальнікаў гэтай любві—усё вырастаючае і стаўшае зараз паўсяместным імкненнем лепшых рабочых і калгаснікаў уступіць у партыйныя рады. Гэта зусім эразумелае імкненне.

Але перш, чым той або іншы таварыш зможа ўступіць у партыю, ён павінен прайсці пэўную праверку, павінен даказаць, што ён дарос да магчымасці быць у партыі. Бо «мы не можам у авангардную партыю прымаць толькі таму, што ён добры рабочы, чэсны чалавек. Такіх-жа чэсных беспартыйных у краіне вельмі многа». (**Кагановіч**).

Для праходжання такой праверкі і выхавання, па рашэнню XVII партыйнага з'езда пры первічных партарганізацыях створаны групы спачуваючых. Значэнне груп спачуваючых у тым, што яны павінны згуртаваць вакол сябе найбольш наблізіўшыхся да партыі рабочых і адданых справе партыі калгаснікаў, правяўшых сябе ў барацьбе з класавым ворагам, паказаўшых на справе сваю адданасць інтарэсам партыі.

З усёй масы спачуваючых асабліваю ўвагу неабходна аддаць тым спачуваючым, якія пераведзены з членаў або кандыдатаў партыі рашэннямі камісіі па чыстцы з-за недастатковай палітычнай грамотнасці, а часамі і палітычнай невытрыманасці. Калі сярод гэтай часткі таварышоў не разгарнуць выхаваўчую работу, не прыцягнуць іх да партыйнага жыцця, яны адрываюцца ад партыйнага жыцця.

Абследаванне **Бабруйскай і Барысаўскай** прамысловых і **Смалявіцкан, Крупскай, Асіпавіцкай, Дзяржынскай і Пухавіцкай** сельскіх партарганізацый паказала, што работа сярод груп спачуваючых пастаўлена зусім неадвальняюча. У радзе партарганізацый няма сур'ёзнага падыходу да прыёму ў спачуваючыя. Прымаюць людзей з малым вытворчым стажам, недастаткова праверяных, слаба правяўшых сябе на грамадскай і вытворчай работе.

У партарганізацыі фабрыкі **«Пролетарская перамога»** (Барысаў), уся падрыхтоўчая работа заключалася ў тым, што ў лістопадзе быў праведзен адзіны партдзень па рабоце сярод спачуваючых. У рэзультаце з 19 таварышоў, прынятых у спачуваючыя за жнівень—верасень месяцы, большасць (12 чал.) з малым вытворчым стажам, недастаткова праверяны на рабоце. Апрача таго, прыняты ў спачуваючыя два таварышы, раней выключаныя з партыі за дэзертырства і недысцыплінаванасць. Гэта гаворыць аб тым, што партком фабрыкі «Пролетарская перамога» не сур'ёзна, не прадумана падышоў да прыёму ў спачуваючыя. А на «Пролетарскай перамозе» ёсць значны касцяк старых рабочых-ударнікаў, з якіх павінны складацца групы спачуваючых. Але партком фабрыкі не разгарнуў масавай работы, пакінуў яе на самацёк і гэтым паказаў няўменне кіраваць такім важным участкам партработы.

Яшчэ больш непрывабная карціна па **Бабруйскаму** лесакамбінату. Там партком нават згубіў сваіх спачуваючых З 20 пераведзеных па чыстцы—9 чалавек невядома куды ўбылі. Уноў прынятых у спачуваючыя 11 чалавек. Але работы з імі, як і з пераведзенымі на чыстцы, партком завода не вядзе. Аддзелаліся тым, што спачуваючых толькі прымацавалі да палітшкол. Але сістэматычнай штодзённай работы сярод іх не праводзілі.

На шкэйнай фабрыцы імя **Дзяржынскага** (Бабруйск) да гэтага часу спачуваючых не афармлены, не прынята ні аднаго чалавека. І гэта на фабрыцы, дзе больш тысячы рабочых, і дзе партыйная прослойка зусім нязначная. З 7 пераведзеных па чыстцы ў спачуваючыя асталося 5 чалавек. Але і аб іх партком мала клапаціўся. Яны нават не размеркаваны па палітшколах.

На **Бабруйскім** фанерным заводзе № 16 з-за таго, што адразу-ж пасля чысткі не была разгорнута работа са спачуваючымі, з 13 чалавек пераведзеных асталося толькі 6. Астатнія пакінулі завод, спасылаючыся на тое, што яны не маюць аўтарытэту, як выключаныя з партыі. Партком завода не здолеў пераканаць таварышоў, што перавод у спачуваючыя гэта не пакаранне, а мера выхавання большэвіка. Аб іх ніхто не клапаціўся, з імі ніякай работы не праводзілі. Спачуваючыя стаялі ў баку ад партыйнага жыцця і ў рэзультаце вымушаны былі пакінуць завод.

Пераведзеныя ў спачуваючыя павінны быць акружаны асаблівай увагай партыйнай арганізацыі, і ў прыватнасці яе сакратара. У нас-жа гэтага часта не бывае. Таму пераведзеныя ў спачуваючыя, неразумеючы, што перавод для іх—школа, працоўшы якую яны могуць і павінны зноў стаць поўнацэннымі членамі партыі, лічаць сябе пакрыўджанымі, непрыгоднымі да партыі і адыходзяць ад яе. Так мы можам страціць многа чэсных, адданых партыі людзей, якім трэба дапамагчы падняцца толькі на адну ступеньку, каб зноў уступіць у партыйныя рады.

Характэрны выказванні спачуваючых.

Тав. **Зайцава** (Смалявіцкі раён) гаворыць: «З дня пераводу мяне ў спачуваючыя я не наведвала ні партсходаў, ні школы палітграматы. Мне ніколі аб гэтым не паведамлялі. Адчуваю, што зусім адарвалася ад партыйнага жыцця».

Другі спачуваючы тав. **Пазанкевіч** (Смалявічы) гаворыць:

«Я быў членам партыі з 1928 г. У 1918 г. быў у Чырвонай гвардыі. У часе чысткі пераведзен у спачуваючыя. Мяне цікавіць партыя, але шкада, што я адстаю ад партыйнага жыцця. Мне ніхто не дапамагае ў палітычным росце».

Калі-б група спачуваючых працавала добра, тав. Пазанкевіч не сказаў-бы, што ён адстае ад партыйнага жыцця.

Станоўчы вопыт работы са спачуваючымі ёсць на Менскай фабрыцы **«Окцябр»**. Тут група спачуваючых складаецца з 51 чал.—23 пераведзеных па чыстцы партыі і 28 чал. упёрш прынятых.

З дня афармлення групы спачуваючых (15 чэрвеня) партыйны камітэт аддаў сур'ёзную ўвагу рабоце са спачуваючымі, пераведзенымі па чыстцы, і вялікую палітыка-выхаваўчую работу сярод беспартыйнага актыва (тут ён вялікі—225 чал.).

У рэзультаце сур'ёзнай штодзённай работы парторгаў цэхаў і сакратара парткома тав. **Канопіка**, лепшыя ўдарнікі падалі заявы аб прыёме іх у групу спачуваючых. Сярод падаўшых заявы старыя рабочыя-кадравікі з шматгадовым вытворчым стажам (тав. **Аксельрод**—38 год, тав. **Ляўкоў**—26, тав. **Хатасевіч**—19). Таварышы, раней нікім незаўважаныя, зараз, пасля ўступлення ў групу спачуваючых, сталі добрымі актывістамі ў грамадскай рабоце і вучобе.

З верасня партком пачаў практыкаваць правядзенне спецыяльных дзён па рабоце сярод спачуваючых. Цікава адзначыць некаторую характэрную асаблівасць правядзення гэтых дзён.

За некалькі дзён да намечанага тэрміну спачуваючыя, самі загадзя абгаварыўшы што лепш паставіць на чарговым сходзе, паведамляюць аб гэтым парторгу цэха і парткому. Такім чынам на сходзе ставяцца пытанні, найбольш цікавячыя спачуваючых. Пасля сходу практыкуюцца калектыўныя паходы ў кіно. Ці трэба спецыяльна адзначаць, што такая форма арганізацыі і правядзення сходаў дае самыя добрыя рэзультаты.

Ёсць асобныя зрывы і недахопы на «Окцябр». Але яны аналагічны прыведзеным намі вышэй, і мы ўпамінаць аб іх не будзем. Адзначым толькі адно буйнае непаразуменне, гэта даручэнне весці школу спачуваючых прапагандысту тав. Цірушкевічу, які на занятках ставіць такія пытанні, як «што падарвала ў корані пяцігодка», «што такое бядняк», «што дала пяцігодка беднякам». Гэты прапагандыст не толькі не ўмее кіраваць школай, але не можа нават добра паставіць пытанне. Безумоўна ён нічога, апрача марнай траты часу, слухачам не дае.

Не гледзячы на недахопы, у партарганізацыі фабрыкі «Окцябр» ёсць чаму павучыцца па рабоце са спачуваючымі.

Некалькі слоў аб рабоце сярод спачуваючых у сельскіх партарганізацыях.

Калі ў большасці нізавых прамысловых партарганізацый работа сярод спачуваючых незадавальняюча, то сельскія партарганізацыі працуюць зусім дрэнна. Так, напрыклад, на **Смалявіцкаму** раёну налічваецца 21 чалавек пераведзеных на чыстцы ў спачуваючыя. Гэтыя таварышы па ўмовах сваёй работы раскіданы па аднаму па ўсяму раёну. Райком партыі з імі ніякай работы не вядзе. Спачуваючыя адарваны ад усякага грамадскага жыцця. Частка з іх настроена так, быццам яны выключаны і ім больш не ўдасца вярнуцца ў партыю. Такое-ж становішча па **Крупскаму, Дзяржынскаму, Асіпавіцкаму, Пухавіцкаму** і іншых раёнах.

Работа са спачуваючымі павінна быць арганізавана так, каб спачуваючы адчуваў, што да яго адносяцца з выключнай клапатлівасцю. Трэба ў кожным спачуваючым бачыць жывога чалавека. Гэта асабліва важна для тых спачуваючых, якія пераведзены па чыстцы партыі. «Трэба прымяняць у рабоце са спачуваючымі багацейшы вопыт арганізацыйных мерапрыемстваў партыі, усяляк заахвочваючы такія формы работы са спачуваючымі, як правядзенне перыядычных гутарак, шафства зусім падрыхтаваных і ідэалагічна вытрыманых членаў партыі над спачуваючымі, індывідуальныя заданні. Трэба дабіцца таго, каб зрабіць групы спачуваючых сапраўды прывадным рэмнем партыі, а саміх спачуваючых—свядомымі моцнымі ў будучым большэвікамі. Але прымяняючы гэтыя формы работы, трэба перш за ўсё і галоўным чынам бачыць у кожным спачуваючым жывога чалавека, які адчувае патрэбу ў штодзённай падтрымцы, у таварыскай парадзе і ў адпаведным, больш чулым падыходзе да яго» (Журнал «Парт. строительство», № 11 за 1934 г.).

Асабліва трэба аддаць сутубую ўвагу марксісцка-ленінскаму выхаванню. Прымы, «калі мы гаворым аб марксісцка-ленінскім выхаванні, мы гаворым не толькі аб школьным выхаванні, мы гаворым аб ідэйным выхаванні большэвіка» (Кагановіч), а адсюль самы сур'ёзны падбор прапагандыстаў і індывідуальная работа са спачуваючымі ў школе, дома, дачы індывідуальных заданняў на грамадскай рабоце, «прыцягненне іх да актыўнага выканання рашэнняў партыі і ўрада».

РАШАЮЧАЯ ПРАВЕРКА

Сёння ў Менску адкрываецца выстаўка швэйных вырабаў фабрык Беларусі і Украіны.

Гэтым завяршаецца першы этап сацыялістычнага спаборніцтва двух буйнейшых рэспубліканскіх трэстаў за гонар сваёй фабрычнай маркі. Але гэта толькі першы этап нашага сацыялістычнага спаборніцтва.

Цяпер барацьба разгортваецца за высокую якасць прадукцыі, за яе лепшую адзелку, за далейшае абагачэнне як дарослага, так і дзіцячага асартыменту, за сапраўды культурнае абслугоўванне спажыўца.

З чым мы прышлі да выстаўкі?

Беларуская швэйная прамысловасць за 9 месяцаў гэтага года значна расшырыла асартымент сваіх вырабаў і палепшыла іх апрацоўку ў параўнанні з мінулым годам. Значна выраслі дзіцячыя вырабы — 6 проц. да агульнага аб'ёму прадукцыі ў 1 квартале і 3,6 проц. у IV квартале бягучага года. Намі праароблена вялікая работа па ўмацаванню існуючых лабараторый і арганізацыі новых. Мы паставілі перад сабой задачу к канцу года мець лабараторыі на ўсіх фабрыках Белшвэйтрэста.

За 1934 год намі значна ўзнята і палепшана мадэліраванне фасонаў асабліва дамскіх і дзіцячых вырабаў, прынятых і зацверджаных к пашыўшы на будучы год, якія вырабляюцца мадэлістамі нашых лабараторый тт. **Бондарэскім, Гусманам, Эйдзлем, Аронсонам, Левінай** і інш., ушчуўшых у гэту справу свой вопыт, сваё ўменне і сваё жаданне змагацца за больш прыгожыя вырабы сваіх фабрык.

За перыяд сацыялістычнага спаборніцтва ліпень-кастрычнік грамадскімі арганізацыямі швэйных фабрык БССР праароблена надзвычай вялікая і цікавая па зместу работа.

Так, на ўсіх фабрыках створаны фабрычныя і пэхавыя журыйныя камісіі, якія штодзённа абмяркоўваюць і ацэньваюць прадукцыю, выпушчаную іх брыгадай, пэхам, фабрыкай. Тут-жа прымаюцца меры да знішчэння заўважаных дэфектаў.

Як правіла, усе гэтыя журыйныя камісіі ўзначальваюцца рэдактарамі шматтыражак, пэхавых і брыгадных штодзёнак.

Матэрыялы тут-жа асвятляюцца ва ўсім фабрычным друку.

Ініцыятыва фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» аб прысваенні імя тав. Сталіна лепшым вытворчым брыгадам у гэтым спаборніцтве падхоплена ўсімі фабрыкамі БССР і цэлым радам спаборнічаючых з вамі фабрык Украіны.

Рэспубліканскай журыйнай камісіяй праведзен пробны адборправерка ўсіх вырабаў фабрык БССР. Абмеркаванне рэзультатаў гэтай праверкі ператваралася на ўсіх фабрыках у сур'ёзнейшую вытворча-тэхнічную нараду адміністрацыйна-тэхнічнага персанала сумесна з лепшымі ўдарнікамі пэхаў.

Вялікім мінусам у нашай рабоце мы лічым тую акалічнасць, што рад нашых фабрык свайго промфінплана за 9 месяцаў г.г. не выканаў. З іх асабліва адсталі: «Комінтэрн» і імя Крупскай. У агульнай складанасці Белшвэйтрэст выканаў план на 96,4 проц.

Паасобныя фабрыкі зусім няправільна зразумелі спаборніцтва за якасць прадукцыі, дапусцілі рыбачэзны прарыў у выкананні вытворчай праграмы.

Што павінна даць выстаўка:

Выстаўка павінна паказаць, наколькі нашы фабрыкі і Белшвэйтрэст у цэлым выканалі свае абавязацельствы перад украінскай швэйнай прамысловасцю, перад арганізаваным пакупцом-рабочым і калгаснікам, наколькі выкананы рашэнні ўсебеларускай нарады пры ЦК КП(б)Б, «Звязды» і Наркомлёгпроме аб **расшырэнні асартымента і паляпшэнні якасці прадукцыі.**

На выстаўцы якасць прадукцыі будзе ацэнена не па процантах браку і перапрацоўкі, а па дабротнасці апрацоўкі. Спажывец на выстаўцы акрэсліць — «чыя марка вышэй».

Швэйнікі Беларусі павінны працягваць спаборніцтва пад лозунгам: ліквідаваць прарыў у выкананні плана, лепш асвоіць вясенне-летні сезон 1935 года, датэрмінова скончыць план IV квартала 1934 года, заваяваць права ранарту гаспадару нашай социялістычнай радзімы— VII з'езду советаў.

Л. КАРАСІК,
кіраўнік Белшвэйтрэста.

УСЕБЕЛАРУСКІ РЭЙД ПРАВЕРКІ ПАДРЫХТОЎКІ ТРАНСПАРТА ДА ЗІМЫ

З 28 кастрычніка па 2 лістапада газеты «Звязда», «Большевистский путь» (орган палітаддзела МББ чыг.) і журналам «Большэвіцкі друк» праводзяць усебеларускі рэйд праверкі падрыхтаванасці ўсіх участкаў транспарта (па лініі МББ чыг) да зімы. Будуць праверены службы эксплаатацыі, паравозное і вагоннае дэпо, пуць, водаснабжэнне, падрыхтоўка да барацьбы са снегам і інш. Адначасова правяраецца выкананне дырэктыў ЦК КП(б)Б аб дапамозе тэрытарыяльных арганізацый транспарту, работа дэпутацкіх груп на чыгунцы і транспартных секцый советаў, удзел іх у падрыхтоўцы транспарта да зімы.

Асноўная задача рэйда — выявіць усе недахопы ў падрыхтоўцы да зімовых перавозак і дабіцца неадкладных мер па іх ліквідацыі.

Рэйд праводзіцца з удзелам мясцовых тэрытарыяльных і транспартных газет, рабкораў прадпрыемстваў і чыгункі **пад знакам падрыхтоўкі да ўсебеларускага з'езда рабселькораў.**

З 10 па 15 лістапада будзе праводзіцца **паўторны** рэйд для праверкі ліквідацыі недахопаў, выяўленых рабкораўскімі брыгадамі ў часе першага рэйда.

Падвядзенне вынікаў рэйдаў будзе прыурочана да адкрыцця III усебеларускага з'езда рабселькораў.

Матэрыялы праверак пасылаюцца ў газеты «Звязда», «Большевистский путь», мясцовыя транспартныя і тэрытарыяльныя газеты.

Масавы ўдзел рабкораў забяспечыць поспех справы. Неабходна на мясцах зараз-жа пачаць падрыхтоўку (складанне рабкораўскіх брыгад, інструктаж іх і т. д.). Трэба, каб рабкоры своечасова даведаліся аб задачах і тэрмінах рэйда, аб сваіх задачах у гэтай рабоце.

«ЗВЯЗДА».
«БОЛЬШЭВІЦКІ ДРУК».

АБ ЗРЫВЕ ДАСТАЎКІ АПАЛУ РАБОЧЫМ ФАБРЫКІ ІМЯ ТЭЛЬМАНА

Пастачова бюро Менгаркома КП(б)Б

Адзначыць, што трыкутнік абуткавай фабрыкі імя Тэльмана праявіў паўнейшую безадказнасць у справе забеспячэння рабочых апалам. Старшыня фабкома тав. **Каплан**, ведаючы аб прынятых ГК і горсоветам мерапрыемствах па мабілізацыі калгаснікаў на вывазку і дастаўку апалу рабочым, не забяспечыў своечасовую вывазку з вызначанага сельсовета апалу, чым выклікаў вымушаны прастой калгаснага транспарта і паказаў сваю няздольнасць і бяздушныя адносіны да матэрыяльна-бытавых патрэб рабочых.

Абвясціць тав. **Каплану** суровую вымову і прапанаваць парткому фабрыкі імя Тэльмана неадкладна абгаварыць пытанне аб магчымасці далейшага астаўлення яго на пасадзе старшыні фабкома.

Папярэдзіць сакратара парткома фабрыкі імя Тэльмана тав. Іонтава, што пры паўтарэнні такіх з'яў ігнаравання матэрыяльна-бытавых патрэб рабочых ён будзе прыцягнут да самай суровай партыйнай адказнасці.

Гэту пастанову апублікаваць у друку і абгаварыць на сходзе рабочых.

Нам. сакратара Менгаркома КП(б)Б ХАДАСЕВІЧ.

Усеузбекская нарада жаноргаў палітаддзелаў МТС з удзелам жаноргаў паўднёвых раёнаў Кіргіліі, прысвечаная бавоўна-уборачнай кампаніі і задачам жаноргаў адкрылася на днях у Ташкенце. На здымку жоноргі тт. Раджабекава (Калінінскі раён), Іонтава (Янгі-Курганскі раён) і Кадырава (Галя-Аран) у часе перапынку чытаюць газету «Кзыл-Узбекістан».

Пісьмы рабочых і калгаснікаў

СТАРШЫНІ МЕНГОРСОВЕТА тав. ЖУКОВІЧУ.

КУЛАЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЦЫРЛІНА

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКАЎ)

У калгасе «КІМ», Самахвалавіцкага сельсовета (Менскі раён) намеснікам старшыні працуе Цырлін Пётр, які да ўступлення ў калгас меў кулацкую гаспадарку і эксплаатаваў наёмную рабочую сілу.

Зараз Цырлін праводзіць шкодную работу, ён свядома ўкрыў 1.004 кілограмы жыта, 138 кілограмаў пшаніцы і 40 кілограмаў аўса.

Па віне шкодніка Цырліна забіта на мяса лепшая свінаматка і сала скарыстоўваецца Цырліным на папойкі.

Пры продажу на рынку гародніны калгасныя грошы прысвойваў. Цырлін зажымае крытыку і самакрытыку, пагражае калгаснікам, якія выкрываюць шкодную яго дзейнасць, выключэннем з калгаса.

КАСЦЮК, ВАЛЕК, ВАЛОДЗЬКА, і інш. (усяго 9 подпісаў).

НАЧАЛЬНІКУ ПАЛІТАДДЗЕЛА ПУХАВІЦКАЙ МТС тав. ЮДОЎСКАМУ

КАЛІ-Ж КОНЧЫЦЦА ВАЛАНІТА?

(ПІСЬМО РАБОЧАГА)

У студзені гэтага года я заключыў умову з прарабам Пухавіцкай МТС Вавенковым зрабіць у новапабудаваных дамах паліталдзела МТС печы.

За работу па дагаворанасці павінны былі заплаціць мне 458 р., але-ж Вавенкоў плаціць не жадае, кажучы, што рахункавод хворы, няма каму скласці ведамасць».

Дырэктар МТС тав. Міранецка, ведае аб гэтым, але ніякіх мер не прымае. **СТАЛОВІЧ.**

НАРКАМЗЕМУ БССР. тав. БЕНЕКУ

БЯСПЛАНАВЫЯ ЗАНЯТКІ

(ПІСЬМО СТУДЭНТА)

У Гарадоцкім тэхнікуме механізацыі сельскай гаспадаркі заняткі праводзяць без навучальна-вытворчага плана. Праграм і падручнікаў па дысцыплінах хіміі, біялогіі і агульнаму машынаназнаўству няма. Выкладанне праходзіць без наглядных дапаможнікаў.

Бібліятэка тэхнікума лічыцца толькі на паперы. Книжкі звалены ў груды і імі не карыстаюцца.

Тэхнікум дровамі не забяспечан, у класах холадна.

РАСЯНКОЎ.

НАМ ПІШУЦЬ

Старшыня калгаса «Рассвет», Востраўскага сельсовета (Клічаўскі раён) **Каўко** не снабжае настаўнікаў малаком і іншымі прадуктамі, заяўляючы: «Мы будзем даваць прадукты таму, хто плоціць па рынкавых цэнах».

Аб гэтым піша нам настаўнік т. Болбас.

***

Калгаснікі калгаса «КІМ» (Чырвонаслабодскі раён) **Банчароў і Качура** пішуць, што Смоліцкі сельсавет забраў дом соцкультуры пад інтэрнат, а калгас не мае дзе праводзіць культработу.

Праўленне калгаса не раз зварачалася да старшыні РВК, але меры не прыняты.

***

Вучні **Цямрук, Мігуцкі** і інш. з дамашчаўскай школы (Шклоўскі раён) пішуць, што ў школе няма падручнікаў па літаратуры.

Райаддзел асветы аб гэтым ведае, але мер не прымае.

***

Настаўнік т. Мініп паведамляе, што старшыня Ягопаўскага сельсовета (Шклоўскі раён) даў загад выдаваць газу ўсім найшчыкам за выключэннем настаўнікаў.

***

На фабрыцы «Комунарка», — піша тав. Фрыд,—не выдаюць прэмій вызначаным ударнікам. Так ударнік шакаладнага цэха тав. Голуб, які быў прэміраван яшчэ ў маі, не можа атрымаць сваю прэмію.

У дзень МЮД'а прэміравалі комсамольцаў Позняка, Брудэра, 24 верасня прэміравалі групу рабкораў Рубінштэйна, Герша, Берагіна і іншых. Але зноў прэміі не выдаюць.

ПА СЛЯДАХ ПІСЕМ

„КУЛАЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ МАКСІМАВА"

Пад такім загалоўкам у «Звязде» 11 верасня было змешчана пісьмо калгаснікаў аб тым, што старшыня калгаса «Пабеда», Гарадоцкага раёна, раскрадвае калгасную маемасць. Аб гэтым ведаў старшыня Халамараўскага сельсовета Ганчароў, але ніякіх мер не прымаў.

Гарадоцкі РК КП(б)Б паведамляе, што факты паданыя ў пісьме, поўнасцю пацвердзіліся.

Старшыня калгаса **Максімаў** з работы знят і аддан пад суд. Старшыня Халамараўскага сельсовета Ганчароў таксама знят з работы.

ПА СЛЯДАХ НЕАПУБЛІКАВАНЫХ ПІСЕМ

У сваім пісьме ў рэдакцыю т. Ф. Тэтур пісаў аб тым, што старшынёй калгаса «Авангард», Хутарскага сельсовета (Чэрвеньскі раён), працуе былы арандатар і спекулянт І. Верабей.

Чэрвеньскі райземаддзел паведамляе, што Верабей з пасады старшыні калгаса знят і выключан з калгаса.

***

Калгаснік т. Тамашоў пісаў, што былы кулак Тр. Дзянісенка прапеў у калгас «Чырвоная Беларусь».

Горацкі райземаддзел паведамляе, што факты пацвердзіліся. Дзянісенка з калгаса выключан.

Залатая рыбка

У буфеце менскага вакзала, як правіла, выдаюць сялядзец або воблу за карпа.

Рыс. Н. Леўшына

ПЛАН ХЛЕБАЗДАЧЫ ВЫКАНАН НА 95 ПРОЦ.

МАСКВА, 19 кастрычніка. (БЕЛТА). К 15 кастрычніка па Саюзу гадавы план хлебаздачы (без гарнцавага збору) выканан на 94,9 проц. супроць 83,8 проц. на той-жа тэрмін у мінулым годзе.

План хлебапаставак па калгаснасялянскаму сектару выканан на 97,5 проц. і план натураплаты — на 86,5 проц. Соўгасы выканалі гадавое заданне па хлебаздачы на 86,7 проц.

К 15 кастрычніка месячны план хлебаздачы па Саюзу выканан на 56,8 проц.

ЗАСЕЯНА 31,5 МІЛЬЁНАЎ ГЕКТАРАЎ АЗІМЫХ

МАСКВА, 20 кастрычніка. (БЕЛТА). На 15 кастрычніка па Саюзу пасеяна азімых на плошчы 34.553 тыс. га — 92 проц. плана. План выканан: калгасамі — на 97 проц., соўгасамі — на 79 проц., аднаасобнікамі — на 71 проц. Узарана на зіму 20.490 тыс. га — 49 проц. плана.

СХОД ПАРТЫЙНАГА АКТЫВА гор. БАРЫСАВА

БАРЫСАЎ, 20 кастрычніка. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

18 кастрычніка адбыўся сход партыйнага актыва, прысвечаны перавыбарам советаў. З дакладам выступіў сакратар ЦВК БССР тав. М. Ляўкоў.

ШАПІРА.

ДОМ АДПАЧЫНКУ ДЛЯ КАЛГАСНІКАЎ

СЛУЦК.

Слуцкая МТС распачала будаўніцтва дома адпачынку для калгаснікаў на 70 чалавек. У дом адпачынку будуць пасылацца лепшыя калгаснікі і калгасніцы—ударнікі і ўдарніцы. (БЕЛТА).

НОВАЯ СТАРОНКА У ГІСТОРЫІ ФІЗКУЛЬТУРНАГА РУХУ

ЗА СОТНІ КАЛГАСНА-МАЛАДЗЁЖНЫХ КАМАНД

Сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Аўгустайціс паведаміў карэспандэнту «Звязды» аб рэзультатах матча паміж калгасна-маладзёжнымі футбольнымі камандамі тт. Дулі і Кармана.

— Комсамол Беларусі разам з ВСФК прарабіў у гэтым годзе вялікую работу па рэалізацыі рашэнняў ХУП з'езда партыі і IX пленума ЦК ВЛКСМ аб задаваленні запатрабаванняў калгаснай моладзі.

Той факт, што ўпершыню социялістычны сектар вёскі перавыканаў заданне ВСФК СССР па здачы норм на значок «Гатоў да працы і абароны», гаворыць аб тым, што комсамол, калгасная моладзь узяліся рашуча за ўкараненне фізічнай культуры ў масы.

Сіламі комсамольцаў - калгаснікаў пабудаваны ў калгасах сотні спартыўных пляцовак. Сам факт гэты ўжо сведчыць аб тым, што фізічная культура пранікае ў найшырэйшыя масы калгаснай моладзі.

Капітан каманды тав. ДУЛЯ.

Футбольны матч калгасна-маладзёжных каманд Дулі і Кармана, праведзены па прыкладу Паўночнага Каўказа, прадэманстраваў рост калгаснай моладзі, як і ўсёй калгаснай вёскі, у культурных і палітычных адносінах.

Матч паказаў, што мы к будучаму году можам і будзем мець не 2, а сотні калгасна-маладзёжных каманд з высокаразвітай тэхнікай ігры, забяспечаных трэнёрамі, падрыхтаванымі з саміх-жа калгаснікаў.

Задача комсамола, фізкультурных арганізацый, паліт-аддзелаў, профсаюзаў цяпер-жа максімальна забяспечыць фізкультурны рух у социялістычным сектары вёскі спартыўным інвентаром і кадрам кваліфікаваных кіраўнікоў для разгортвання зімовых відаў спорта (лыжы, канькі, хакей) у калгасах, соўгасах, МТС.

Калі ўсе арганізацыі, асабліва раённыя, возьмуцца моцна за справу фізкультуры ў калгасах, мы бясспрэчна к будучаму году будзем мець дзесяткі і сотні каманд у калгасах па асобных відах спорта.

КАЛГАСНІКІ-ФУТБАЛІСТЫ НА ПРЫЕМЕ У тав. РАТНЕКА

Перад ад'ездам у раёны каманды футбалістаў лепшых маладзёжна-калгасных брыгад рэспублікі наведалі начальніка палітсектара МТС НКЗ БССР тав. Ратнека.

У жывой гутарцы з тав. Ратнекам маладыя футбалісты социялістычных палёў падзяліліся вынікамі адбыўшагася футбольнага матча.

Тав. Ратнек задаў рад пытанняў. Капітаны каманд, лепшыя брыгадзіры, адзін за другім расказваюць аб культурным і заможным росце іх калгасаў.

Тав. Карман паведамляе, што ў гэтым годзе ў калгасе «Комунар», Капыльскага раёна, пабудаваны ўзорная чытальня з бібліятэкай, фізкультурная пляцоўка (першая ў раёне) і лазня. Працуе хор. Ёсць сёлета на працадзень?—цікавіцца тав. Ратнек.

Тав. Гук—старшыня калгаса імя Закоўскага—адказвае: з кгр. хлеба і 12 кгр. бульбы.

Тав. Ратнек пытаецца, як працуе моладзь і ці не спрачаецца са старымі.

Стары дзядуля тав. Козляк упэўнена заяўляе:

— Добра працуе моладзь, паважае старых.

У заключэнне тав. Ратнек адзначыў неаходнасць узняцця футбольнай работы ў калгасах на высокую ступень, каб гэта перпае і каштоўнае пачынанне ўзварушыла ўсю калгасную моладзь БССР. (БелТА).

БЛІСКУЧАЯ ПЕРАМОГА СОВЕЦКІХ БАКСЁРАЎ

Як мы паведамлялі 19 кастрычніка, вярнулася з-за граніцы зборная каманда СССР па боксу, выязджаўшая ў Нарвегію і Чэха-Славакію.

У гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» совецкія спартсмены расказалі аб сваіх уражаннях.

— Паездка нашых баксёраў за граніцу і рэзультаты сустрэч з мацнейшымі камандамі з'явіліся тыумфам совецкага фізкультурнага руху.

Совецкая каманда вярнулася на радзіму, не маючы ні аднаго паражэння. Мы ўшлі з рынга з гонарам. 15:6 у Нарвегіі, 29:13 у Чэха-Славакіі. Гэты агульны вынік сустрэч на карысць СССР — красамоўны паказальнік росту спартыўнай тэхнікі совецкіх баксёраў.

За граніцай такога рэзультата не чакалі. Думалі, што совецкім баксёрам па плячу толькі рабочыя каманды, а буржуазныя спартыўныя клубы недасяжны. Паражэнне нацыянальнай зборнай Чэха-Славакіі арабіла ўражанне выбухнуўшай бомбы. Нацыянальная зборная Чэха-Славакіі лічылася мацнейшай камандай. Яна ўжо на працягу некалькіх год трымала пяршынства ў Сярэдняй Еўропе.

Увесь друк, уключаючы социялдэмакратычны і фашысцкі, быў поўны самых пахвальных водзываў аб совецкіх баксёрах. Газеты адзначалі не толькі добрую падрыхтоўку але і высокую тэхніку совецкіх баксёраў. «Прагер міттаг» пісала: «Выдатныя совецкія баксёры паказалі зусім нечакана высокі клас. Яны з'яўляюцца вынослівымі і быстрымі барцамі, уладаючымі тэхнікай бокса. Совецкая каманда паказала, што яна належыць да лепшых прадстаўнікоў бокса ў еўрапейскім маштабе». Газета «Попедні ліст» адзначала: «Тое, што паказалі нам учора совецкія баксёры, з'яўляецца майстэрствам вышэйшага еўрапейскага класа. Гэта не былі навічкі, а моцна трэніраваныя барцы, якія прымушалі нас здзіўлівацца ўзроўню іх тэхнікі і тактыкі».

Прыяцельская і надзвычай цёплая сустрэча, якая аказалася нам як прадстаўнікам СССР, з боку пролетарыяў, асабліва Чэха-Славакіі, служыла для нас моцнай зарадкай.

Пога даўно не бачыла такога відовішча. Тысячы пролетарыяў прышлі на пляц перад вакзалам, чакаючы нашага прыезду. Калі поезд прыбыў, натоўп змёў усе паліцэйскія загароды і з крыкамі: «Няхай жыве Совецкі Саюз!» кінуўся да вагона і вынес нас да аўтобуса літаральна на руках. Закідалі кветкамі. Сотні людзей прабавалі паціснуць нам рукі, каб вітаць прадстаўнікоў Совецкага Саюза.

Спробы паліцэйскіх прымусіць аўтобус быстра праехаць па вуліцах аказаліся безрэзультатнымі. Пролетарскія фізкультурнікі-веласіпедысты ехалі ўпераздзе і не давалі аўтобусу хутка рухацца. Сустрэча вышла далёка за рамкі звычайнай спартыўнай падзеі.

Ля будынка гасцініцы «Акса», упрыгожанага совецкімі сцягамі, тысячы людзей наладзілі прыяцельскую дэманстрацыю ў гонар Совецкага Саюза. На працягу ўсіх дзён прабывання ў Празе ў гасцініцу прыходзілі экскурсіі рабочых і работніц для гутаркі з намі.

З 12 раёнаў Чэха-Славакіі былі атрыманы запрашэнні. У гарняцкім раёне Кладно і ў металургічным раёне Брно, дзе нашы баксёры мелі сустрэчы, была наладжана прыяцельская дэманстрацыя ў гонар совецкіх фізкультурнікаў.

Поспех не ўскружыў нам галоў. Мы ўпэўнена барацьбу за далейшае павышэнне нашай спартыўнай тэхнікі, за сусветныя рэкорды.

М. КІН.

Негарэлае.

ДАПАМОГУ ГОРАДА—ВЁСЦЫ

Намеснік старшыні ВСФКБ тав. Кузняцоў у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» заявіў наступнае:

— Праведзены ўпершыню ў гісторыі фізкультурнага руху Беларусі футбольны матч паміж двума калгаснымі футбольнымі камандамі з'явіўся дэманстрацыяй росту социялістычнай культуры ў вёсцы і яе сустаўной часткі — фізічнага выхавання. Матч з'явіўся вынікам вялікай работы, праведзенай фізкультурнымі арганізацыямі па прасоўванню фізічнага выхавання ў калгасную вёску. Наяўнасць у вёсцы звыш 500 гурткоў, каля 800 пляцовак і 4.500 здаўшых нормы па комплексу «Гатоў да працы і абароны» сведчыць аб тым, што мы зрабілі вялікі крок уперад па шляху стварэння арганізаванага фізкультурнага руху ў социялістычным сектары вёскі. Але дасягнутага, зразумела, недастаткова. Задача заключаецца ў тым, каб, замацоўваючы гэтыя поспехі, узняць фізкультурную работу на вёсцы на вышэйшую ступень і перш за ўсё па лініі якасці. У вёсцы мы маем многа талантлівых людзей, а якіх могуць і павінны вырасці знатныя людзі совецкага спорта.

Капітан каманды тав. КАРМАН.

Неабходна дабіцца, каб нашы калгасы і соўгасы аснасціліся футбольнымі, валейбольнымі і баскетбольнымі камандамі і лёгкаатлетамі. Аб тым, што гэта магчыма сведчыць практыка работы калгасаў імя Закоўскага, Слуцкага раёна, і «Комунар», Капыльскага раёна.

Патрабуецца толькі, каб была праяўлена неабходная ініцыятыва і тады справа арганізацыі ў калгасе гуртка фізкультуры і спартыўнай пляцоўкі будзе забяспечана.

Вялікую дапамогу фізкультурнай арганізацыі ў разгортванні фізкультурнай работы на вёсцы аказваюць комсамол і паліт-аддзелы.

Няма ніякага сумнення ў тым, што ўжо ў прадстаячым зімовым сезоне мы дабіемся яшчэ большых поспехаў на фізкультурным участку агульнага фронту социялістычнага будаўніцтва ў вёсцы.

Гарадскія фізкультурнікі павінны аказаць вясковым фізкультурнікам больш дзейную дапамогу ў гэтай вялікай справе.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Ніжэйпералічаныя таварышы выклікаюцца сёння, 21 кастрычніка, у 7 гадзін вечара на нараду ў ЦК КП(б)Б (зала пленума). Яўка абавязковая.

ЦК КП(б)Б.

Адам, Спарыхін, Еленеўскі, Вішнеўскі, Варонін (НКФ); Варшаўскі (ашчадкаса); Кін (Сельбанк); Вайрашэўскі (Усекабанк); Маркаў, Бярэзінскі (Дзяржбанк); Валахновіч (Промбанк); Панкоў, Касцюковіч, Валасевіч (Дзяржплан); Біге, Кандакоў, Русовіч, Малзіт (ЦВК); Сянкевіч, Шкадарэвіч, Млодэк, Трыфсік, Шабалтас, Пятровіч (СНК); Голанд, Шыддлер, Гоўаман (УНХУ); Ляхаў, Афенгейм, Ластоўскі, Матусевіч (Белкаапсаюз); Сямёнаў (Харчгандаль); Нісенбаум (Таргсін); Копін (Саюзтабак); Слонім (Дзяржплан); Свірыдаў, Айзенсон, Кладовікаў, Сулькіна (Наркамместпром); Анікейчык (Белплодагароднына); Хейфец, Анцішкін (Галоўдартранс); Хмель (Белтранс); Валюкевіч (будаўн. тэатра); Сакольчык, Бабіцкі (Белторф); Давідовіч (Галоўліт); Рамановіч (Дом урада); Брыскін, Дунец, Сукоўскі, Голубева, Зарэцкі (Наркомгас); Аніскові (Аўтарэмснаб); Казімірчык (Наркомлес); Петракоў (Лесбел); Бязносаў (Белхарчпром); Олікер, Бельскі (Наркомаховы здароўя); Элксне (міліцыя); Гудзейка (Белдзяржспірт); Куркоў (ВЭО); Любіч (БАКТ); Зелюткін (Наркамюст); Канцлер (Рыбтрэст); Скок (ЦП швейнікаў); Хеўлін, Гераўкер (ЦСПСБ); Гакк, Савоста, Залескі, Манахава, Легон (Наркамзем); Вялюга (Луттрэст); Каштальян (нам. Упаўкамзаг); Вайновіч, Брушкоў (Заготлён); Майсееў (Маслапром); Аспін (Заготзярно); Кандыбовіч (НКХарчпром); Хадзько (інстытут); Урбановіч (Сельгасснаб); Сідараў (Заготжывёла); Дзмітрыеў (с.-г. навук. інстытут); Сокалаў (ін-т хіміі); Зюськоў (Гістпарт); Зянькевіч, Лахман, Бабак, Каўрыгін, Гвяздецкая (ЦК); Врублеўскі (НКЗ); Шастакоў («Калгаснік Беларусі»); Грынглаз («Звязда») Дзе рах («Рабочий»); Левітан (АЗЕТ); Рудзінскі (Белводгас); Верба, Буевіч (НКунутранога гандлю); Валожын (Белгандаль); Лейзераў (НКЮст); Абрамаў (Верхсуд); Годзер (Наркамюст); Кудзельскі (Верхсуд); Валынская (Белпушніна); Смаль (Металатрэст); Ляруціх (Заготшэрсць); Штромберг, Касцюкевіч, Шаўроў (ЦК); Сакалінскі, Захарава, Гурыцкая, Багард, Пракоф'ева (ЦСПСБ); Кеніг (Шклотрэст); Васерман (Будтрэст); Тарасаў (Ільнотрэст); Елін («Всепромутыль»); Сімаёўскі (Асоавіяхім); Зелічонак (Белкаапсаюз); Пілінёнак (ЦП саюза машынабудаўніцтва); Іуры (Наркомлес); Фонгауз (ЦСПСБ); Жарскі («Орка»); Александровіч (саюз пісьменнікаў); Міхайлаў (СНК); Эгле (камітэт апалу); Ладычук (Соўгасснаб); Кузняцоў (ВСФК); Ласман, Мікельсон (ЦВК); Сямашка (Рыбтрэст); Фрыдман, Варонічаў (СНК); Галятоўскі (Дзяржбанк); Сапрыцкі (Наркамзем); Осіпаў (ЦП РДУ); Гаеў (БУС); Ліцманаў (НКЗем); Шапіра (НКЛес); Арндт (Белдзяржснаб); Пятроў, Лешчынскі (Наркомасветы); Палей (Наркамлегпром); Орсік (НКЗем); Гурэвіч (Экспартлес); Мельцэр (мед-інстытут); Ерафееў (ЦК КП(б)Б); Мельнікаў (Наркамюст); Панкевіч (БелАН); Рудзіцкі (ін-т права); Султанаў (Менмалпр); Ерынкевіч (НКАсветы); Шэрман (Луттрэст); Акмен (радыёцэнтр); Нямірскі (НКаховы здароўя); Рофман (ін-т сов. права); Паўлоўскі («Звязда»); Конанаў (цэнтр. дом селяніна); Жукаў (Партвыдат); Кузняцоў (Белторф); Урбановіч (Сельгасснаб); Ларычкін (леннарттарадок); Трус (курсы марксізма); Алейнікаў, Каранеўскі (НКЗ); Андрэеў (Асоавіяхім); Галавач (саюз пісьменнікаў); Зайчык, Гарадзецкая, Буднік (ЦСПСБ); Перкін (Скуртрэст); Шаевіч («Сахарсбыт»); Шлык (НКФ), Любін (фабрыка «Комунарка»); Пехцераў (інспекцыя НКПІ); Альтман (БЕЛКМО), Аксенцаў (навукова-даследчы інстытут харчовай прамысловасці); Шыфрын («Рабочий»); Фуганзінц (Саюзмука); Цімошкін (ЦП саюза сельпром); Эпштэйн (завод імя Варашылава), Каронік (фабрыка «Окцябр»); Каранцдзей (Белрыбтрэст); Ратнер (спецлабараторыя); Славін (Белпромторф); Мархашоў (ЦП саюза лесасплава); Чорны (Дзяржплан); Сычоў (Белапертрэст); Бампі (трэст будматэрыялаў); Басаў (Саюзгаготскур); Бедынерман (Белпаліграфтрэст); Ардашнікаў (Белэлектратрэст); Нісневіч (НКПіжпром); Каган (НК мясцов. прамысл.); Градштэйн (ЦСПСБ), Коф ман (Лесбел); Гісін (Белчыцына); Хамелянскі (Белпушніна); Капцельсон (УНХУ); Эпштэйн (ЦП саюза дрэваапрацоўшчыкаў); Мураўскі (ЦП саюза папернікаў), Кілаў (Белкомунбуд); Мамаеў (Гідраметслужба); Новогрунт (НКЗ); Багарад (ЦП саюза нархарч); Гравіт (Белмяса); Барзукоў (Белпромлеб); Кузьмічоў (Спіртрэст); Лісаў (Белплодвінпром); Манькоў («Звязда»).

Адк. рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

МЕНСК

АЗЕЛЯНЕННЕ ГОРАДА

Трэст зялёнага будаўніцтва разгортвае работу па асеннему дрэванасаджэнню. Пасаджана ўжо 600 новых дрэў. Поўнасцю закончана пасадка па Універсітэцкай вуліцы. У план азелянення ўключаны Грушаўскі пасёлак, Бабруйская вул., вул. Энгельса ад Совецкай да Універсітэцкай, Маскоўская, Гарбарна-Набережная і інш. На працягу восені будзе пасаджана 6.000 дрэў і 16.000 кустоў.

⊙ ⊙ ⊙

★НОВЫЯ ДЗІЦЯЧЫЯ ПАЦКІ — настольныя більярды і веласіпедныя пялежкі — пачынае выраблянць упільнях рэнаапрапоўчага завода імя Молатава. У IV квартале будзе выпушчана 3.000 більярдаў і 3.500 пялежак.

★ІНТЭРНАТ ДЛЯ 150 СТУДЭНТАЎ медыцынскага інстытута па Ленінградскай вул. закончан Менбудам і здан у эксплаатацыю.

★ СУКНА на 200.000 руб., шоўку на 200.000 руб., льняных тканін на 120.000 руб. атрымае універмаг да окцябрскіх свят.

Прамысловая арцель імя Фрунзе, вырабляючая перламутровыя гузікі з рачных ракушак, штомесячна перавыконвае план.

Арцель мае добрыя майстэрні. У дзень выробляецца да 40.000 гузікаў. На здымку: абточка ракушак.

ВЫСТАЎКА ПРАДУКЦЫІ АБУТКОВЫХ ФАБРЫК БССР

Гэтымі днямі ў Менску ў клубе імя VII з'езда прафсаюзаў адкрываецца выстаўка прадукцыі абутковых фабрык БССР. На выстаўцы будзе прадстаўлена звыш 1000 экспанатаў рознага абутку. Абутак будзе ўзят без адбору, прама з канвеера

Фабрыкі, выпускаючыя лепшы абутак, атрымаюць права пасылкі сваіх экспанатаў на ўсесаюзную выстаўку, якая адкрыецца да VII з'езда Советаў.

⊙ ⊙ ⊙

★ З'ЕЗД ЗНАТНЫХ ЛЮДЗЕЙ ДАРОЖНАГА БУДАЎНІЦТВА склікаецца 15 снежня. У яго рабоце прымуць удзел 250 лепшых змагароў з бездарожжам і каля 100 гасцей з іншых рэспублік і абласцей Саюза. З'езд будзе прысвечан вынікам дарожнага будаўніцтва па БССР за 1934 год і задачам 1935 года.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР ОПЕРЫ і БАЛЕТА
маст. кіраўнік—засл. арт. рэсп. ГІТГАРЦ І. А.

Зімовы сезон 1934 г.
Рэпертуар ОПЕРЫ
ПІКАВАЯ ДАМА муз. Чайкоўскага, паст. рэжыс. Мэск. маст. тэатра ЦВК СССР імя М. ГОРКАГА МАРДВІНАВА Б. А.
КНЯЗЬ ІГАР музыка Барадзіна, паст. ЧАРНЯУСКАГА Б. А.
Прем'ера СЕВІЛЬСКІ ЦЫРУЛЬНІК муз. Расіні, паст. БАРЫСЕВІЧ О. М.

Спектаклі з 26-х па 31-XII 1934 г.
Рэпертуар Балет
ЧЫРВОНЫ МАК музыка Гліэра, паст. КРАМАРЭУСКАГА Л. М.
Прэм'ера КАПЗЛІЯ музыка Дэліба
Адкрыц ё 26 кастрычніка
Білеты ў касе тэатра з 12—2 і ад 5—8 гадз. веч. і ў рабочай касе.

Прымаюцца заявукі ад ФЗМК на культпаходы, мэтавыя паказы і на паставленні месцы для ўдарнікаў і ЗОТаўцаў. Даведкі па тэл. № 24-905.

Памяшканне Дзяржаўнага Яўрэйскага Тэатра (Валадарскага, 7)
23 і 24 кастрычніка
ДВА АДКРЫТЫЯ КАНЦЭРТЫ
вялікага сімфанічнага аркестра Белрадыёкамітэта пад кіраўніцтвам дырыжэра Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра Саюза ССР, народнага артыста рэспублікі
Л. П. ШТЭЙНБЕРГА
пры ўдзеле саліста М. З. АРЛОВА (віаланчэль).
ПАЧАТАК у 8 гадз. 30 мін.
Білеты прадаюцца ў рабочай касе і ў касе тэатра. Па калектыўных заяўках—скідка.

АНОНС! ГЭТЫМІ ДНЯМІ!
ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
Едзе замежны АТРАКЦЫЁН
ФРАНКАРДЗІ
САЧЫЦЕ ЗА РЭКЛАМАЙ.

УСЕ на ВЫСТАЎКУ!
з 21 па 31 кастрычніка
АДКРЫВАЕЦЦА ВЫСТАЎКА
ПРАДУКЦЫІ ШВЭЙНЫХ ФАБРЫК БЕЛАРУСІ І УКРАІНЫ,
якія ўключыліся ва ўсесаюзны конкурс на лепшую фабрычную марку
„ЧЫЯ МАРКА ВЫШЭЙ",
„ХТО ЛЕПШ ШЫЕ".
Выстаўка адкрыта штодзённа з 11 г. раніцы да 10 г. вечара у с. КЛУБЕ ГОРСОВЕТА (пляц Волі, 4)
УВАХОД ВОЛЬНЫ.
Пры выстаўцы ёсць экскурсаводы. Арганізуйце калектыўнае наведванне.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ПРОЛЕТАРЫЙ"
СЁННЯ, 21 кастрычніка і штодзённа
НАТА ВАЧНАДЗЕ
у мастацкім фільме, вытворчасці Дзяржкінпром Грузіі
ГЮЛЛІ
драма ў 8 частках.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ ПАСЛЯ КОЖНАГА СЕАНСА
КАНЦЭРТ
УСХОДНЯГА АНСАМБЛЯ пад кіраўніцтвам кампазітара САГАРУНІ.
МУЗЫКА, СПЕВЫ, ТАНЦЫ
НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ І КАСЮМЫ.
ПАЧАТАК сеансаў—5-45, 7-15, 9, 11г.
КАСА адкрыта з 1 гадзіны дня.

ГУКАВЫ кіно тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Мастацкі фільм ПЫШКА
Кіно Інтэрнацыянал АСЯ па аповесці І. С. ТУРГЕНЕВА
Кіно СПАРТАК БЭЛА па раману Лермантава драма ў 8 частках

ЦЫРКАВОЕ ЭТРАД АЕ БЮРО
Наркомасветы БССР даводзіць да ведама ўсіх культаддзелаў саюзаў, загадчыкаў клубамі, фабзаўкомаў і інш. зацікаўленых арганізацый, што з 15 кастрычніка
ЦЭБ'ам прымаюцца заяўкі
на мастацкае абслугоўванне артыстычнымі сіламі Окцябрскіх свят.
Для мастацкага абслугоўвання окцябрскіх свят спецыяльна запрашаюцца артысты вышэйшай кваліфікацыі як БССР, так і іншых рэспублік наступных жанраў: юмар, сатыра, скетчы, ансамблі, цырк, балет, інструменталісты і інш.
Прыём заяваў штодзённа з 10 гадзін раніцы да 4 гадзін дня ў памяшканні ЦЭБ, клуб Соўгандальслужачых (рог Энгельса і Комуністычнай, пакой № 8, тэл. 22-755).
ЦЭБ.

СЁННЯ ў 6 гадз. вечара ў памяшканні Беларускага дзяржаўнага тэатра
21 кастрычніка адбудзецца
агульна-гарадскі злёт ударнікаў фінансавага фронта
па пытанню аб выніках выканання фінплана III квартала, задачах IV квартала і падрыхтоўцы да XVII гадавіны Окцябрскай рэвалюцыі і з'ездаў советаў (даклад наркома фінансаў БССР тав. ХАЦКЕВІЧА).
Пасля злёта пастаноўка Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
Запрашальныя і тэатральныя білеты раздаюцца камсодам у горкамсодзе (памяшканне горсовета, пакой 22).
Усім ФЗМК забяспечыць атрыманне білетаў і яўку фінактывам на злёт к указанаму часу.
Менгарком КП(б)Б, ЦСПСБ, ГАРФА.

26-га кастрычніка ў 7 гадзін вечара, у Доме партактыва (рог вул. Энгельса і Карла Маркса), склікаецца
НАРАДА ПРОФАКТЫВА гор. МЕНСКА.
ПАРАДАК ДНЯ:
Аб удзеле профактыва ў рабоце бюро скаргаў Камісіі Совецкага Кантроля (дакладчык—ч. в. а. упаўнаважанага КСК пры СНК СССР па БССР—тав. КОМЕЕЎ М. М.).
На нараду павінны з'явіцца: старшыні ФЗМК, старшыні рэвізійных камісій, цэхпрофарганізатары, члены дэпутацкіх груп горсовета, рабочыя каналтраперы, грамадскія кантролёры, бюро скаргаў, рабкоры газеты „Рабочий", вынаходнікі-рацыяналізатары.
Рэгістрацыя пачнецца ў 6 з палов. гадз.
ЦЭНТРАЛЬНЫ СОВЕТ ПРОФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ. РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ „РАБОЧИЙ". БЮРО СКАРГАЎ УПУЛНАВ. КСК па БССР.

22-га кастрычніка ў 6 гадзін вечара, у клубе Соўгандальслужачых (рог Энгельса і Комуністычнай) адкрываецца
ПЕРШАЯ ГАРАДСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ МЕНГОРСПАЖЫЎСАЮЗА
Мандаты дэлегатам канферэнцыі выдаюцца штодзённа з 10 гадзін раніцы да 4 гадз. дня і з 6 да 8 гадз. веч. у памяшканні Менгорспажыўсаюза (Совецкая № 68, 3 паверх) пакой № 8.
Пры атрыманні мандатаў неабходна прадставіць матэрыялы агульнага схода (пратакол і вестка па форме № 1).
Партгрупа канферэнцыі адбудзецца роўна ў 5 гадзін вечара.
Оргбюро Менгорспажыўсаюза.

МЕНСКІ ЯЎРЭЙСКІ ЗООТЭХНІКУМ
(Курасоўшчына, тэл. 22-365)
аб'яўляе дадатковы набор студэнтаў
на 1 курс у ліку 30 асоб.
Прымаюцца асобы, скончыўшыя сем класаў сярэдняй школы
Тэхнікум забяспечвае інтэрнатам, стыпендыяй ад 35 да 60 руб. і сталовай.
Прыём заяў да 1 лістапада.
Іспыты з 1 лістапада. Заняткі пачнуцца 5 лістапада.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Белдзяржтэатр Оперы і Балета аб'яўляе конкурс у вакальна-масавы ансамбль (ХОР)
Іспыты будуць праводзіцца ў памяшканні тэатра (рог К. Маркса і Урыцкага, б. клуб Леніна 18-19-20 кастрычніка з 11-12 гадзін дня і з 6 да 8 г вечара.
Для іспытаў неабходна наяўнасць пачатка голасу і ведання нот.
Зв'ясні даведкамі заварачацца ў канцылярыю тэатра да заг. рэж. кіраўн. тав. Пятрова.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Сёння 21 кастрычніка ў 19 гадзін у канферэнц-зале Акадэміі навук (Ленінская, 29-35, II паверх), адбудзецца
ДАКЛАД
старшага навуковага работніка інстытута эканомікі Акадэміі тав. І. М. КАПЛІНСКАГА
на тэму:
„Цана на сучасным этапе і праблема пераходу да адзінай цаны".
Запрашаюцца навуковыя работнікі, эканамісты, студэнцтва і работнікі совецкага гандлю. Уваход вольны.
Тэзісы даклада можна атрымаць у сакратарыяце інстытута эканомікі.

КІРАЎНІЦТВА КОНЕВОДСТВА НКЗ БССР
даводзіць да ведама ўсіх гаравскіх і раённых арганізацый БССР,
маючых патрэбнасць у рабочых конях на 1935 год,
што 15 кастрычніка пачынаецца
ПРЫЁМ ЗАЯВАК.
Заяўкі падаюцца раённымі і гарадскімі арганізацыямі Конкіраўніцтву НКЗБ Дом Урада, пакой 130.
Апошні тэрмін падачы заявак на рабочых коней—20 лістапада 1934 г
У заяўцы спажыўца павінна быць указана:
1) Колькасць патрэбных коней на 1935 г. па сортах (рабочых прамысловых і транспартных—дробных, сярэдніх і буйных)
2) Колькасць патрэбных коней паквартальна на 1—2—3 і 4.
3) Месца знаходжання гаспадаркі, вуды коні, п'ятрэбны і дакладны паштовы адрас
Несвоечасная падача заявак і поўная адсутнасць апошніх пазбавіць магчымасці уключыць у план загатоўкі коней на 1935 г
Кіраўніцтва коневодства НКЗБ.

Полацкая аўтатрактарная школа механікаў і брыгадзіраў аб'яўляе асенні набор
Прымаюцца асобы ва ўзросце ад 20 да 35 год маючыя адукацыю за 5—6 класаў.
У школу механікаў прымаюцца асобы з вытворчым стажам трактарыста або шофера не менш трох год. У школу брыгадзіраў—не менш двух год.
Прыём заяў да 1 лістапада г. г. Да заявы прыкладваюцца наступныя дакументы: анкета, даведка аб нараджэнні, аб адукацыі, аб сацыяльным становішчы, аб вытворчым стажы і месцы працы, аб здароўі і марак на 40 кап.
Вучні забяспечваюцца стыпендыяй ад 60 да 80 руб., інтэрнатам і сталовай.
Адрас: г. Полацк, К. Маркса, 43.
Дырэкцыя.

Адвінокаму ПАТРЭБЕН невялікі ПАКОЙ.
Пажадана ў цэнтры. Аплата па згодзе
Аб умовах звяніць па тэлефону 21-360 да 5 гадзін

Нарсуд Брагінскага раёна абвяшчае грамадзянскае ганьбаванне гр. Р. Н. ШРАМЕНОК, вгодна прыгавару суда ад 21-III-34 г.

1 ліпеня прапаў ХЛОПЧЫК 10 год, русы, вочы карыя. Ведаючых аб яго месцазнаходжанні прашу паведаміць: п-а Орша, БССР, Машкоўскі с-с, калгас імя 1 мая, або вёска Арлоўшчына, СІМАКОВУ Архіпу Іванавічу.

Друкарні «Звязда»
ПАТРЭБНЫ:
вартаўнікі для аховы друкарні, прыймшчыкі на ратацыйнай машыне і вучні-ліватыпісты.
Звяртацца, Совецкая, 83, II-гі паверх, да дырэктара, з 12 да 1 гада. дня.

Адміністрацыя, МК калектыў Белфудгаса выказваюць спачуванне начальніку фінансава-учотнага аддзела т. Кучы С. Ф. з прычыны смерці ягонага сына Маўрыкія Александровіча.

Менск, друкарня «Звязды». Выпускаючы — КРУЧКОЎ, ст. карэктар — БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж — Н. ПЕРАКЛАДНЁЎ, ст. стэрэатыпёр — ПЕДЗІКАЎ, ст. друкар — АНУЧЫН. Уп. Галоўлітбела № К—3274.